

СВЯТА СЯМ'І
І ТРАДЫЦЫЙ
Сямейная газета

У ТОПЕ –
ГАННА І МАЦВЕЙ
Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
27 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 124 (30258)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід КАСІНСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны:**

*«Сёння гісторыя і гістарычная праўда — гэта поле бою. Поле бою, на якім мы прайграць не маем права. Калі мы прайграем, у нашай краіны не будзе будучыні. Занадта высокія стаўкі. На Захадзе нацэлены на наша маладое пакаленне, таму што старэйшае пакаленне ўжо не перакапаць. І на гэтым полі бою мы з вамі павінны не толькі абараняцца, але і актыўна наступаць».*

# Добрых вам думак і добрых навін




Вольга ЛАЎРАНЮК працуе ў аддзяленні паштовай сувязі Бальшавік Мінскага раёна. Яна, можна сказаць, прадоўжыла паштовую дынастыю: яе маці Ірына Юр'еўна, цяпер пенсіянерка, працавала ў тым жа аддзяленні. Вольгу чакаюць з любімай перыёдыкай і з добрымі навінамі. Напрыклад, Надзея Сцяпанаўна САРМАНТ выпісвае «Звязду» ажно з 1961 года. Прызнаецца: любіць нашу газету за беларускую мову. Бо на роднай мове, кажа, толькі добрыя думкі прыходзяць.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Калону ваеннай тэхнікі на парадзе 3 ліпеня ўзначаляць знакавыя танкі Т-34.**
- Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі 27—28 чэрвеня з-за гарачыні.
- **Міжнародны інавацыйны маладзёжны форум пройдзе ў Мінску ў 2025 годзе.**
- Гандлёвыя сеткі працягнулі скідку 10 % на шэраг тавараў для ўразлівых катэгорый насельніцтва.
- **Натарыусы Беларусі 2 ліпеня будуць кансультаваць бясплатна.**
- Да канца года плануецца адкрыць тры новыя станцыі мінскага метро.
- **ДАІ: электронны пашпарт могуць увесці для ўсіх аўто ў Беларусі.**
- У Беларусі зарэгістравана 4,3 млн транспартных сродкаў.

Спажывец

# ЛЕТА Ў ЗАПАС

## Што і пачым закупляе сёлета Белкаапсаюз?

**Сезон масавай нарыхтоўкі садавіна-гароднінная прадукцыі ў разгары. Сёлета ён наступіў раней, чым летась, пры тым, што і ў мінулым годзе стартаваў на парадак раней за папярэднія гады, расказала начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза. Па якіх цэнах прымаюць нарыхтоўшчыкі сельскагаспадарчую і дзікарослую прадукцыю?**



### Сезон нарыхтовак

«Сезон нарыхтоўкі гародніны пачаўся ўжо напрыканцы сакавіка, — адзначыла **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.** — Што датычыцца ягаднай прадукцыі, у гэтым годзе суніцы садовыя, напрыклад, пачаліся на два тыдні раней за леташні сезон, а ў 2023 годзе іх сезон распачаўся на паўтара тыдня раней, чым у 2022-м. У мінулыя гады масавы сезон нарыхтоўкі суніц садовых стартаваў прыкладна 15 чэрвеня, а ў гэтым ён ужо згортваецца, і цяпер мы пачынаем весці бягучую нарыхтоўку сартоў суніц садовых, якія спеюць пазней — аж да жніўня».

СТАР. 14

Форум магчымасцяў

# Будзем сябраваць рэгіёнамі!



Гэтымі днямі ў горадзе на Дзвіне, а таксама ў Полацку і Наваполацку праходзіць XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Мерапрыемства Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, тэма якога сёлета вызначана як «Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў пабудове інавацыйнай эканомікі Саюзнай дзяржавы», упершыню прымаюць адразу тры гарады. Арганізатары падрыхтавалі насычаную дзелавую праграму. Плануецца, што ў межах форуму будзе падпісана не менш як 165 пагадненняў і звыш сотні камерцыйных кантрактаў на суму 30 мільярдаў расійскіх рублёў. Акрамя таго, удзельнікаў форуму, многія з якіх з'яўляюцца гасцямі нашай краіны, чакае шматпланавая культурная праграма, якая прадэманструе яднанне нашых народаў не толькі ў эканамічнай сферы, але і на духоўным узроўні.

*Сачыце за нашай газетай і за сайтам zviazda.by — мы раскажам і пакажам усё падрабязна.*

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

ISSN 1990 — 763X
24124

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе 2024 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З нагоды

# Мінск — горад гераічнага супраціўлення

## Гісторыя 1100 дзён яго барацьбы адзначана высокім званнем

**Роўна 50 гадоў таму, 26 чэрвеня 1974 года, беларускай сталіцы было прысвоена ганаровае званне «Горад-герой» з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». У сувязі з гэтым на плошчы Перамогі адбылася ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак. Ушанаваць памяць герояў прыйшлі кіраўніцтва Мінгарвыканкама, структурных падраздзяленняў, адміністрацый раённаў горада, дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горада.**






Фота Віктара ДРАЧОВА.




Першымі кветкі ўсклалі Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля Качанава, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём Цуран.

«Мы выказваем вялікую павагу тым, хто абараніў свабоду і незалежнасць нашай краіны. І прысваенне Мінску звання «Горад-герой» — не проста так, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Зусім няшмат гарадоў, што маюць такое высокае званне за заслугі, што былі праяўлены людзьмі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сёння гэта мае вялікае значэнне і таму, што фашызм, неанацызм зноў падымае галаву. Мы павінны зрабіць усё, каб памяць і не дапусціць гэтага надалей. Мы прымаем законы, працуем па ўвекавечанні памяці. Прысваенне сталіцы звання «Горад-герой» кажа аб шматпакутнай гісторыі, якая была ў нашага горада і краіны ў цэлым. Бо горад Мінск быў знішчаны практычна цалкам, але тут працавала падполле, тут людзі рабілі ўсё для таго, каб наблізіць Перамогу. І сёння мы святкуем сапраўды вялікае свята для Мінска, мінчан, усёй нашай краіны і беларускага народа. Вечная памяць тым, хто абараніў свабоду і незалежнасць нашай краіны. А мы, нашчадкі тых гераічных людзей, зробім усё для таго, каб захаваць гэты мір, такое прыгожае блакітнае неба, якое сёння над нашай краінай. Аб подзвігах герояў мы будзем памятаць заўсёды!»

Парламентарый нагадала: калі прыйшла Перамога, трэба было аднавіць з руін прадпрыемствы, заводы, фабрыкі, сацыяльныя аб'екты. Людзі рабілі гэта з энтузіязмам. У самыя кароткія тэрміны стварылі інфраструктуру, рабілі ўсё для таго, каб запрацавалі прадпрыемствы, таму што разумелі: трэба працягваць жыць у імя тых, хто склаў свае галовы за свабоду і незалежнасць. Паводле яе слоў, людзі ў пасляваенныя гады, аднаўляючы з руін краіну, здзейснілі працоўны подзвіг.

«Гэта яшчэ і подзвіг тых людзей, якія стварылі нашу суверэнную, незалежную краіну. Калі мы апынуліся на развале Савецкага Саюза, разумелі, што нам трэба жыць, ствараючы сваю выдатную, суверэнную і незалежную краіну. У найбліжэйшыя дні мы будзем святкаваць Дзень Незалежнасці — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нізкі паклон тым, хто ваяваў на палях бітвы, хто быў у падполлі і ў партызанскіх атрадах, хто аднаўляў нашу краіну ў пасляваенны час і рабіў усё для таго, каб сёння Беларусь была суверэннай і незалежнай», — заключыла Наталля Качанава.

«Прысваенне сталіцы ганаровага звання «Горад-герой» — гэта вялікая ацэнка людзям, якія цаной свайго жыцця забяспечылі вызваленне нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — падкрэсліў **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ.** — Наша галоўная задача — заўсёды падтрымліваць высокі давер, які быў аказаны гораду Мінску. Людзі, што змагаліся ў партызанскіх атрадах, у Мінскім падполлі, марылі аб шчаслівай будучыні для нашай краіны, для сваіх дзяцей і ўнукаў. Мы павінны быць годнымі нашчадкамі продкаў, зрабіць усё для захавання міру, каб людзі на нашай зямлі жылі шчасліва, упэўнена стваралі будучыню, заўсёды ведалі, што яны годныя грамадзяне нашай краіны. Мы зробім усё, каб наша краіна квітнела і развівалася. Асабліва гэта адчуваецца напярэдадні нашага вялікага свята — Дня Незалежнасці, 80-годдзя вызвалення Беларусі. Сёння ўсе мы павінны быць разам!»

Цяпер многае робіцца для таго, каб сучаснае, і асабліва маладое, пакаленне ўспаміналa сваіх суайчыннікаў, герояў, якія наблізілі Перамогу. У кожнай навучальнай установе Мінска ствараюцца музеі, куды людзі прыносяць фатаграфіі сваіх сваякоў, узнагароды і дакументы ваенных і пасляваенных гадоў. Гарадскія ўлады гэта падтрымліваюць. Моладзь масава прыходзіць да помнікаў, мемарыяльных дошак, ускладае кветкі. «Яны адчуваюць сувязь пакаленняў, адчуваюць, што з'яўляюцца годнымі нашчадкамі пераможцаў», — лічыць мэр Мінска.

Ён расказаў, што беларуская сталіца пасля вайны ўяўляла сумнае відовішча. «Нават ставілася пытанне аб пераносе сталіцы ў іншае месца. Але мінчане, якія вярталіся пасля вайны ў свой родны горад, зрабілі ўсё для таго, каб аднавіць яго. Гэта была вельмі цяжкая работа. Не хапала тэхнікі, людзі пасля сваёй асноўнай работы добраахвотна прыходзілі працаваць па расчыстцы горада. Гэта дазволіла на працягу кароткага перыяду аднавіць інжынерныя сістэмы. У першы год пасля вызвалення адкрыліся і запрацавалі 58 новых заводаў. Таму сёння мы разумеем, што нам дасталася ў спадчыну краіна, якая зрабіла ўсё для свайго аднаўлення. Мы ў сваю чаргу зробім усё, каб быць годнымі паслядоўнікамі гэтых людзей», — сказаў Уладзімір Кухараў.

Кіраўніцтва сталіцы вядзе актыўную падрыхтоўку да святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. «Упэўнены, што ў Дзень Незалежнасці Мінск будзе выглядаць годна. У нас пройдуць важныя і сур'ёзныя мерапрыемствы. Ідзе актыўная падрыхтоўка сталіцы да гэтага вялікага дня. Я думаю, што жыхары і госці Мінска з задавальненнем наведаюць святочныя мерапрыемствы і даведаюцца для сябе шмат новага», — падагульніў кіраўнік горада.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кеніі аб'явілі надзвычайнае становішча на фоне пратэстаў



Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на ўказ галоўнага сакратара па абароне Адэна Бары Дуале, апублікаваны ва ўрадавым весніку Kenya Gazette. «Сілы абароны Кеніі накіраваны ў падтрымку паліцэйскім у сувязі з надзвычайным становішчам у сферы бяспекі, выкліканым жорсткімі пратэстамі па ўсёй Кеніі, якія працягваюцца і прыводзяць да разбурэнняў інфраструктуры», — адзначаецца ў дакуменце. Пры гэтым старшыня Камісіі Афрыканскага саюза Муса Факі Махамат заклікаў бакі супрацьстаяння ў Кеніі пачаць канструктыўны дыялог. Адпаведная заява распаўсюджана ў афіцыйным акаўнце арганізацыі ў сацсетцы. «Старшыня АС Муса Факі Махамат з глыбокай заклапочанасцю сочыць за ўспышкамі гвалту ў выніку пратэстаў грамадскасці ў Кеніі, якія прывялі да гібелі людзей і матэрыяльных страт», — адзначаецца ў дакуменце. Афрыканскі саюз пацвярджае падтрымку ўрада Кеніі і заклікае да падтрымання міру, бяспекі і стабільнасці ў краіне. Як вядома, пратэсты пачаліся 18 чэрвеня і дагэтуль працягваюцца ў розных гарадах.

### У Германіі ўсталяваны рэкорд па банкрутствах кампаній за апошнія 10 гадоў



За першае паўгоддзе ў Германіі было зарэгістравана каля 11 тысяч банкрутстваў кампаній, што магло закрануць 133 тысячы работнікаў. Гэта найвышэйшы паказчык за амаль 10 гадоў, перадае нямецкі таблоід Bild. Колькасць банкрутстваў сёлета за шэсць месяцаў узрасла амаль на 30 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. На думку экспертаў, прычыны ў наступствах леташняй рэцэсіі, крызісе і слабым эканамічным развіцці. Гэтыя фактары «падточваюць стан многіх кампаній». Спецыялісты прагназуюць працяг такой дынамікі да канца года. Характэрна, што стала закрывацца на парадак больш сярэдніх і буйных кампаній, такіх як Galeria Karstadt (нямецкая сетка ўнівермагаў са штаб-кватэрай у Кёльне) і FTI-Touristik (трэці па велічыні еўрапейскі тураператар пасля TUI і DER Touristik).

### СААЗ папярэджвае аб глабальным аднаўленні выпадкаў халеры



Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэдзіла аб усплёску захворвання на халеру ў розных рэгіёнах свету, паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. Па звестках СААЗ, з пачатку гэтага года ў 24 краінах зарэгістравана амаль 195 тысяч выпадкаў халеры і больш за 1,9 тысячы смерцяў ад яе. Найбольшая колькасць — у рэгіёне Усходняга Міжземнамор'я, за ім ідуць Афрыканскі, Амерыканскі рэгіёны, Паўднёва-Усходняя Азія і Еўрапейскі рэгіён. Ніводнага выпадку захворвання не было зафіксавана ў рэгіёне Заходняй часткі Ціхага акіяна. Сусветная арганізацыя адзначыла, што да сакавіка яна вычарпала свае глабальныя запасы аральных вакцын супраць халеры, але ў пачатку чэрвеня змагла перавысіць «надзвычайны мэтавы паказчык у 5 млн доз». У СААЗ паведамілі, што са студзеня мінулага года 16 краін запыталі 92 млн доз аральных вакцын супраць халеры. Цяпер СААЗ, Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) і іншыя партнёры сумесна працуюць над пошукам доўгатэрміновых рашэнняў праблемы халеры.

Новае скліканне

# Справа кожнага

## Дэпутат Крупенькін — аб міры як галоўнай каштоўнасці, якую трэба захоўваць на падмурку гістарычнай памяці

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Брэсцкай-Пагранічнай выбарчай акрузе № 4 Андрэй КРУПЕНЬКІН працуе ў Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы. Наша размова адбылася, калі ў краіне праходзілі шматлікія мерапрыемствы з нагоды Дня Усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, таму найперш гаворка зайшла аб міры як галоўным набытку і галоўнай каштоўнасці.**



На адным з памятных мерапрыемстваў у Брэсцкім раёне.

— У Брэсце гэты дзень успрымаецца асабліва па зразумелых прычынах: тут 83 гады таму вайна пачыналася, — гаворыць Андрэй Канстанцінавіч. — Нядаўна прымаў удзел у выязной сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Мы якраз праязджалі па прыгранічных вёсках, тых населеных пунктах, на якія абрынулася фашысцкая ваенная машына ноччу 22 чэрвеня. Акурат у такую ж пару, калі прырода асабліва прыгожая летняй зелянінай, калі пяюць птушкі, на галовы людзей, на дахі пабудоў паляцелі снарады... Усё гэта мы асабліва востра адчуваем, калі прыходзім на жалобны мітынг у Брэсцкую крэпасць у тры гадзіны ночы.

«Лічу названае мерапрыемства адным з самых важных не толькі ў ідэалагічным сэнсе, але і ў эмацыянальным, чалавечым, — працягвае суразмоўца. — Жыву ў Брэсце больш за 10 гадоў, шмат разоў бываў на такіх мітынгах і заўважаў, як брастаўчане ганарацца сваёй гісторыяй, як прыходзяць у крэпасць цэлымі сем'ямі, прыводзяць сяброў і знаёмых з іншых гарадоў. Гэта асабліва адчуваецца на начных мерапрыемствах, калі перад світаннем збіраюцца сотні, а то і тысячы людзей, іх вядзе сюды менавіта покліч душы. Вось і сёлета мы прыйшлі ў крэпасць, аддалі даніну павагі героям вайны і яе ахвярам, нагадалі аб каштоўнасці міру на нашай зямлі».

Гаварыў аб гэтым са сваімі выбаршчыкамі дэпутат Крупенькін і падчас сустрэчы ў Лышчыцах, якая адбылася нядаўна. На сустрэчу прыйшлі прадстаўнікі працоўных калектываў установ сацыяльнай сферы Лышчыцкага сельсавета, ААТ «Астрамечава», вясковыя пенсіянеры. Размова таксама найперш зайшла пра пытанні вайны і міру. Дэпутат і дэлегат Усебеларускага народнага сходу сваімі словамі ў даходлівай форме патлумачыў людзям неабходнасць абнаўлення ваеннай дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Засяродзіў увагу на тым, што дакументы прымаліся, каб яшчэ раз падкрэсліць мірны характар ініцыятыў нашай дзяржавы, нагадаць, што мы нікому не пагражаем, але ж здолеем за сябе пастаяць. Гаварылі аб змене сітуацыі вакол нашай краіны за апошнія гады, аб тым, як важна цяпер, нягледзячы на разнастайныя санкцыі і пагрозы, умацоўваць нашу эканоміку. «Эканамічная бяспека цяпер выходзіць на першы план і залежыць ад працоўнага ўдзелу кожнага на сваім месцы», — сказаў дэпутат.

Андрэй Крупенькін падзяліўся тым, што яго радуе з першых дзён дэпутацкай работы: нямала людзей ўздымаюць пытанні міжнароднай абстаноўкі, захавання міру на нашай зямлі. Людзі гавораць аб тым, што мір трэба захаваць любой цаной, што наша краіна выпакутавала права на мірнае неба яшчэ ў той вайне, памяць пра якую мы асабліва беражліва захоўваем.

А яшчэ парламентарый расказаў пра выпадак, які выклікаў замілаванне. Падчас нядаўняй паездкі па Брэсцкім раёне зазірнуў у дзіцячы садок вёскі Новыя Лышчыцы, пагаварыў з выхаванцамі старшай групы. На пытанне, кім хочуць стаць дзеці, пачуў розныя адказы, а некалькі хлопчыкаў заявілі, што хочуць Радзіму абараняць. Дапытваўся нават у выхавацеляў, можа, навучылі іх так гаварыць. Аказалася, не, дзеці самі так разважаюць, вядома, пад уплывам абстаноўкі ў сям'і і выхаваўчых мерапрыемстваў у дзіцячай дашкольнай установе.

Дарэчы, для Андрэя Крупенькіна гістарычная памяць, шанаванне подзвігу продкаў — справа таксама глыбока асабістая. Абодва яго дзяды — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Абое, як ён лічыць, у свой час аказалі ўплыў на яго выхаванне. Эстафету ёсць каму перадаваць. Сын Андрэя Канстанцінавіча вучыцца ў кадэцкім класе адной з брэсцкіх школ. Напрыклад, летась ён прымаў удзел у гістарычнай рэканструкцыі падзей першага дня вайны раніцай 22 чэрвеня ў Брэсцкай крэпасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Андрэя КРУПЕНЬКІНА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі з трагічнай гібеллю Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германія (2016 — 2024 гг.) Дзяніса Уладзіміравіча СІДАРЭНКІ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Глабальны кантэкст

# ПЕРАМОЖЦЫ І ПЕРАМОЖАНЫЯ

## Хто і навошта спрабуе памяняць іх месцамі



**Хочаш разбурыць дзяржаву — пазбаў яе гісторыі, хочаш знішчыць народ — пазбаў яго гістарычнай памяці. Напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гэтая ісціна набывае асаблівы сэнс і практычна сакральнае значэнне-папярэджанне.**

Невыпадкова ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь сярод пагроз нацыянальнай бяспецы асобным пунктам выдзелены — страта значнай часткай грамадзян традыцыйных маральных каштоўнасцяў і арыенціраў, разбурэнне нацыянальных культурных і духоўных традыцый, скажэнне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным мінулым беларускага народа.

Гісторыя ва ўсе часы з'яўлялася зброяй палітычнай барацьбы. Аднак на працягу дзесяцігоддзяў не падвяргаліся рэвізіі вынікі Вялікай Айчыннай вайны. Міжнародны аўтарытэт СССР, гістарычная памяць пакалення, якое перажыло жахі вайны, не дапускалі маніпуляцый з гістарычнай праўдай.

Аднак да сярэдзіны 70-х гадоў XX стагоддзя інтарэсы сусветных эліт, якія імкнуцца да глабальнага дамінавання, запатрабавалі карэкціроўкі гісторыі. Мэтай працэсу выступала імкненне пазбавіць Захад ад віны за ініцыяванне вайны і імкненне развянчаць вобраз СССР як галоўнага «магільшчыка» «карычневай чумы». Спачатку былі разгорнуты навуковыя дыскусіі, публічныя абмеркаванні, у рамках якіх было «выяўлена» падабенства дактрын двух таталітарных рэжымаў, тоеснасць ідэалогій камунізму і фашызму. У працэс фарміравання «новай рэальнасці» былі ўкладзены вялізныя фінансавыя сродкі, а прапаганда ідэй «гістарычнага рэнесансу» стала асновай нацыянальнай палітыкі шэрагу дзяржаў. Пры гэтым спрэс выдаляліся сутнасць расавай тэорыі і чалавеканенавісніцкіх планаў Гітлера.

Вялікабрытанія, ЗША, Францыя былі зацікаўлены ў пераглядзе гісторыі Другой сусветнай вайны ў сілу імкнення зняць з сябе адказнасць за падзел Чэхаславакіі, палітыку папушчальніцтва і прымірэння агрэсара ў перадваенны перыяд, крэдытаванне фашызму. Краіны, якія ўдзельнічалі ў вайне на баку Германіі: Італія, Венгрыя, Румынія, Славакія, Фінляндыя, Нарвегія, Харватыя, Аўстрыя, Іспанія, Данія, Чэхія — атрымалі ўнікальную магчымасць перайсці з разраду пераможаных або памагатых агрэсара ў разрад «ахвяр савецкай таталітарнай імперыі».

З другой паловы 1980-х гадоў атацы з боку заходніх, а таксама некаторых айчынных гісторыкаў падвяргаюцца прычыны, характар, вынікі Другой сусветнай вайны, ставіцца пад сумнеў уклад СССР у разгром фашызму, вызваленчая місія Савецкай Арміі, прычыны паражэнняў і крыніцы перамог, роля народных мас і палкаводцаў. Адной з вядучых тэндэнцый у многіх краінах стала замоўчванне злачынстваў нацыстаў і праўды аб Савецкім Саюзе.

Пры гэтым зусім забываецца, што яшчэ Гітлер гаварыў аб вайне з Савецкай Расіяй як аб аб'яднаным паходзе Захаду, а славянам як народу наогул адмаўлялася ў праве на самастойнае існаванне.

Вынікам мэтанакіраванай атакі на сусветную гісторыю стала:

- фарміраванне канцэпцыі «роўнай адказнасці» Германіі і Савецкага Саюза за развязванне вайны;
- перамяншэнне ўкладу Савецкага Саюза і Чырвонай Арміі ў разгром фашызму і перабольшанне яго на карысць саюзнікаў; стварэнне вобраза СССР як «няправільнага саюзніка»;
- дэгераізацыя воінскага подзвігу савецкага народа;
- дыскрэдытацыя вызваленчай місіі Чырвонай Арміі ў Еўропе і на Далёкім Усходзе.

Істотнае месца ў гэтым працэсе займала глабалізацыя, апорай якой сталі інфармацыйная рэвалюцыя, што забяспечвае тэхнічную базу для стварэння камунікатыўных сетак і пранікненне ў сферу фарміравання духоўных прыярытэтаў. Аднак каналы інфармацыйнага абмену маюць нязначны бедны і ўбогі культурны змест.

Сучасны чалавек, адмовіўшыся ад кніг, філасофскага мыслення, гістарычнай праўды, трапіў пад уладу злых «гномаў масавай культуры», якія навязваюць уласнае светаразуменне. Адным са значных дасягненняў мэтанакіраванага інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння стала перайменаванне ўсенароднага свята. Сёння для большасці краін Еўропы гэта не Дзень Перамогі (9 мая), а Дзень памяці і прымірэння (8 мая). Па сутнасці, удзельнікі гітлераўскай кааліцыі і іх памагатыя, якія ўвасабляюць аб'яднаны Захад, ажыццявілі фарматаванне грамадскай свядомасці і ўкараненне новых ідэалаў.

Сучасныя «тэарэтыкі і псеўданавукоўцы» спрабуюць паднесці гісторыю як міф асветы, як бяссілле чалавечага розуму, не здольнага кіраваць ёю. Сцвярджаецца, што гістарычная рацыянальнасць вычарпала сябе як спосаб самаадукацыі, сучаснаму грамадству не важная гістарычная праўда, а саму гісторыю варта разглядаць як разнавіднасць літаратурнай творчасці.

У выніку была створана новая канцэпцыя гісторыі Другой сусветнай вайны, якая базіруецца на прызнанні роўнай адказнасці СССР і Германіі, якая дазваляе перавесці СССР (Расію) з разраду краін-пераможцаў, слупоў сучаснага светапарадку ў ранг пацярпелага паражэнне агрэсара. Захад — паводле новай канцэпцыі гісторыі вайны — выратавальнік чалавецтва ад чумы XX стагоддзя — таталітарызму ў форме нацызму і сталінізму, а Расія, як і пасляваенная Германія, — правапераемнік агрэсіўнай таталітарнай імперыі, з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі. Калі Германія даўно ўстала на шлях выпраўлення і адкуплення і заслужыла ўвайсці ў сям'ю цывілізаваных народаў, то Расіі яшчэ трэба будзе гэты шлях прайсці. Яго абавязковай умовай з'яўляецца «поўнае раззбраенне» перад «свабодным светам», шчырае пакаянне, пакрыццё ўрону «акупаваным» краінам, вяртанне «захопленых» тэрыторый і многае іншае.

Сёння пасляваеннае пакаленне Еўропы і большасці дзяржаў свету ўпэўнены ў тым, што пераможцамі ў Другой сусветнай вайне былі амерыканцы з англічанамі і французамі, а ў якасці ворага называецца Расія. Гістарычная праўда падмяняецца яксным фальсіфікатам, а ісціна практычна не запатрабавана. Звёнамі аднаго ланцуга, накіраванымі супраць ісціны, варта лічыць прыраўноўванне нацысцкай і савецкай сімволікі ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, масавае знішчэнне помнікаў чырвонаармейцам, адраджэнне нацысцкіх шэсцяў. Усё гэта накіравана на дэвальвацыю гістарычнай памяці народа, стварэнне вобраза ворага, які супраціўляецца прагрэсу цывілізацыі.

Барацьба за свядомасць людзей, у тым ліку за духоўныя і нацыянальныя каштоўнасці, набывае геастратэгічныя маштабы. Найважнейшае месца ў гэтым працэсе належыць гістарычнай праўдзе і яе носьбітам. Сучасныя маніпулятары настолькі загуляліся з фактамі і іх інтэрпрэтацыяй, што пачалі забываць ісціны, якія ўпісаны ў аналы гісторыі. Польшча была заваявана Германіяй за 36 дзён, а Магілёўская бітва доўжылася 26 сутак. Данія пратрымалася роўна дзень, а ўся Еўропа скарылася за тры месяцы. (Францыя пратрымалася 43 дні.) Сучасным еўрапейцам нялішнім будзе нагадаць, што планамі Гітлера прадугледжвалася поўная ліквідацыя іх дзяржаўнасці з уключэннем тэрыторый у склад вялікага германскага рэйха. І вызваляць іх давялося нашым салдатам, паклаўшы на алтар перамогі над фашызмам мільёны жыццяў. Памятаць аб гэтым — наш святы абавязак.

Не лішнім для «знаўцаў» гісторыі будзе нагадаць рэакцыю кіраўніка ваеннай дэлегацыі Германіі генерала-фельдмаршала Кейтэля, які 9 мая 1945 года ў Берліне пры падпісанні другога Акта аб безагаворачнай капітуляцыі вермахта, убачыўшы ў зале прадстаўнікоў Францыі, здзіўлена ўсклікнуў: «А гэтыя таксама нас перамаглі?»

Гістарычная памяць і праўда пра вайну выступаюць своеасаблівымі засцерагальнікамі, якія гарантуюць мір у сучасным грамадстве. Перамога над фашызмам з'яўляецца найважнейшым духоўным стрыжнем, вакол якога аб'ядноўваюцца дзясяткі мільёнаў людзей. Яна стала сімвалам нашай агульнай гісторыі — сімвалам подзвігу і гераізму нашых бацькоў і дзядоў. Невыпадкова фальсіфікацыя гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў з'яўляецца найважнейшай часткай стратэгіі глабальнага дамінавання.

Масавы гераізм спрабуюць сцерці з людской памяці, самаахвярнасць апашляюць, маральныя ідэалы высмейваюць і зводзяць да прымітыўнага фанатызму, сапраўдныя падзеі і дакладна ўстаноўленыя факты падвяргаюцца рэвізіі, іх сутнасць падмяняецца вырванымі з кантэксту дэталямі і ваенна-палітычных падзей і працэсаў. Іншымі словамі, робіцца спробы размывання духоўных асноў грамадства, ператварэння нас у натоўп, пазбаўлены гістарычнай памяці, што вядзе да страты суверэнітэту і дзяржаўнасці.

«Людзі, будзьце пільныя!» — заклік чэшскага пісьменніка Юліуса Фучыка, пакаранага фашыстамі, сёння вельмі актуальны. Сучаснае становішча диктуе неабходнасць дапоўніць яго другой часткай «Беражыце гістарычную праўду, вучыцеся на яе прыкладах і не паўтарайце памылак...»

Мы, беларусы, дакладна ўсведамляем гэту неабходнасць і захоўваем уласную гісторыю. Мы, народ-пераможца, памятаем усіх загінулых паймення, ганарымся імі, не дазволім нікому спекуляваць памяццю і манкіраваць святымі паняццямі: свабода, незалежнасць, Айчына. А калі спатрэбіцца — абаронім родную зямлю, абаронім свой суверэнітэт, як гэта ўжо не адзін раз рабілі нашы гераічныя продкі.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**

# БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ, ЗАОЧНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) И ДОКТОРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ НАУЧНО-ОРИЕНТИРОВАННОГО ОБРАЗОВАНИЯ В 2024 ГОДУ.**

## План приема лиц для получения научно-ориентированного образования за счет средств республиканского бюджета на 2024 год в Белорусском государственном университете

| Организация-заказчик | Шифр специальности | Аспирантура | | | | Докторантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Всего | Из них по форме обучения | | | Всего | Из них по форме обучения | |
| | | | Дневная | Заочная | Соискательство | | Дневная | Соискательство |
| УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники» | 01.01.02 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 01.02.04 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.02.08 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 01.04.02 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| СООО «Белитсофт интернешнл» | 01.04.02 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.03 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.04 | 2 | 1 | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.05 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.07 | 0 | | | | 2 | 2 | |
| УО «Белорусский государственный медицинский университет» | 01.04.07 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.01 | 2 | 1 | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.02 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 02.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.06 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.03 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| ГУО «Ратичская средняя школа» | 03.02.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Витебский государственный университет имени П. М. Машерова» | 03.02.08 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| ГПУ «Национальный парк «Нарочанский» | 03.02.08 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.08 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.02.10 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| ОАО «Беларуськалий» | 05.13.18 | 1 | | | 1 | | | |
| УО «Международный государственный экологический институт имени А. Д. Сахарова» Белорусского государственного университета | 05.13.18 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 05.13.19 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.25.02 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.27.01 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 07.00.02 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| ГУО «Институт пограничной службы Республики Беларусь» | 07.00.02 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.03 | 2 | 2 | | | 2 | 2 | |
| Организация-исполнитель | 07.00.06 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.07 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 07.00.09 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 07.00.15 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 08.00.05 | 4 | 4 | | | 1 | 1 | |
| УО Федерации профсоюзов Беларуси «Международный университет «МИТСО» | 08.00.05 | 1 | | 1 | | 1 | 1 | |
| ООО «ТАУРУСГРУПП» | 08.00.05 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 08.00.10 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 08.00.13 | 4 | 3 | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 09.00.03 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| УО «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» | 09.00.03 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 09.00.11 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| ГУО «Средняя школа № 51 г. Минска» | 10.01.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 10.01.01 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 10.01.01 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.01.02 | 2 | 2 | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.01.03 | 2 | 2 | | | 1 | | 1 |
| УО «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова» | 10.01.03 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 10.01.10 | 5 | 3 | | 2 | 1 | 1 | |
| УО «Минский государственный лингвистический университет» | 10.01.10 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 10.02.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Белорусский государственный технологический университет» | 10.02.01 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 10.02.01 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.02.02 | 1 | | | 1 | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.02.19 | 2 | 1 | | 1 | 0 | | |
| УО «Белорусский государственный экономический университет» | 10.02.19 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| УО «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова» | 10.02.19 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Минский государственный лингвистический университет» | 10.02.19 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 10.02.21 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой» | 12.00.02 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Национальный центр законодательства и правовых исследований Республики Беларусь | 12.00.03 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 12.00.03 | 5 | 5 | | | 0 | | |
| УО Федерации профсоюзов Беларуси «Международный университет «МИТСО» | 12.00.03 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 12.00.03 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 12.00.04 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.06 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| МОУВО «Белорусско-Российский университет» | 12.00.06 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Минский городской суд | 12.00.09 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.09 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 12.00.10 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Министерство иностранных дел Республики Беларусь | 12.00.10 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 12.00.11 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» | 12.00.12 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 12.00.13 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| УО «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова» | 12.00.15 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 12.00.15 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| ГУО «Гимназия № 2 г. Солигорска» | 13.00.02 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.02 | 2 | 1 | | 1 | 0 | | |
| ГУО «Средняя школа № 5 г. Солигорска имени Героя Советского Союза В. И. Козлова» | 13.00.02 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| УО «Военная академия Республики Беларусь» | 13.00.02 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 13.00.08 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 19.00.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| ГУО «Республиканский институт высшей школы» | 19.00.05 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 19.00.05 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 22.00.01 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Филиал ФГБОУВО «Российский государственный социальный университет» в г. Минске Республики Беларусь | 22.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 22.00.04 | 2 | 1 | | 1 | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 22.00.08 | 1 | 1 | | | 1 | 1 | |
| Администрация Фрунзенского района г. Минска | 23.00.02 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 23.00.04 | 2 | 2 | | | 1 | 1 | |
| Академия национальной безопасности Республики Беларусь | 23.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Главное разведывательное управление Генерального штаба Вооруженных Сил Республики Беларусь | 23.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Министерство иностранных дел Республики Беларусь | 23.00.04 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| ГУ «Научно-исследовательский институт Вооруженных Сил Республики Беларусь» | 23.00.04 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Организация-исполнитель | 24.00.01 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 24.00.03 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 25.01.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 25.03.01 | 4 | 4 | | | 0 | | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 25.03.02 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Организация-исполнитель | 25.03.10 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.01* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.02* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.04* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.01.05* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.10* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 01.04.21* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.09* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 02.00.21* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.03* | 2 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.06* | 2 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 03.01.07* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.01* | 3 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.11* | 2 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.17* | 2 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.18* | 3 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.13.19* | 4 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 05.27.01* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.02* | 1 | | | | 0 | | |
| Организация-исполнитель | 07.00.03* | 1 | | | | 0 | | |

* **Форма обучения по выбору (дневная, заочная, соискательство)**

Лица, поступающие в аспирантуру в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине.

Кандидатские экзамены и дифференцированный зачет по общеобразовательным дисциплинам должны быть сданы до поступления в аспирантуру.

Для лиц, поступающих в аспирантуру в форме соискательства, сдача вступительного экзамена не требуется. Наличие сданных кандидатских экзаменов по общеобразовательным дисциплинам не обязательно.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в заочной форме получения образования и в форме соискательства должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

**Подробная информация по правилам приема размещена сайте БГУ (http://www.bsu.by).**

**Справки по телефонам: +37517 209-51-73, +37517 209-50-24.**

**Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2024 года по адресу: г. Минск, ул. Бобруйская, 9, к. 414, 419.**

Время работы отдела аспирантуры и докторантуры: понедельник–четверг с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.15, пятница с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.00.

УНП 100235722

Сямейная газета

Выпуск № 11 (236)

Думкі ўслых

# Піць лета па кроплі



*«НІКОЛІ не раздзяляла ўсеагульнай эйфарыі з нагоды лета. Бо лета — гэта праца. Палоць агарод, ратаваць бульбу ад каларадскіх жукоў, пасвіць кароў, збіраць ягады, адмахваючыся ад неадчэпных камароў, пераварочваць і зграбаць у стагі сена, — дзеліцца сваімі дзіцячымі ўспамінамі сяброўка. І потым з настальгіяй дадае: — Але гэта было так па-сапраўднаму...»*

*«Лета — гэта маленькае жыццё, — кажа яшчэ адна прыяцелька, якая вельмі любіць загараць і стараецца «злавіць» кожны сонечны праменьчык. — Гэта «велік», шыкоўныя заходы і світанкі, пасядзелкі з сябрамі каля вогнішча да ночы. Лета — гэта ягады з куста, міска з пенкай ад варэння, якое не закаталі і можна адразу есці. Гэта пяткі, што не адмываюцца ад травы і зямлі. Лета — гэта бясконца доўгі дзень. І сотні сонечных зайчыкаў-успамінаў».*

*Цяпер паўсюль размоў — толькі пра лета. Вось на мінулым тыдні ехала ў маршрутцы. І кіроўца, каб падтрымаць размову з пастаянным пасажырам, кінуў: «Ну вось і большая частка чэрвеня ўжо прайшла...» — «Ага, месяц праляцеў як адно імгненне, я нават і не заўважыў».*

*«На канікулах пабег купацца, не паспеў нырнуць, — ужо пара вылазіць і зноў у школу. Ад таго і туга бярэ, — згадаліся радкі з рамана Рэя Брэдберы «Віно з дзьмухаўцоў». Безумоўна, мы, людзі, не ў сілах стрымаць час. Але ж можам не пражываць яго «на аўтамаце», а напаўняць значнымі толькі для нас момантамі. Таму, каб не расплюхаць лета і потым не шкадаваць аб упушчаных магчымасцях, у гэтым годзе я вырашыла паспець ухапіць як мага больш летніх цудаў. У першую чаргу, захаваць лецейка ва ўспамінах. Пакуль што адзін з самых яркіх — як мы ў гадавіну нашага з мужам вяселля купаліся ў вадаёме з відам на Нясвіжскі замак.*

*...На гэта лета ў мяне шмат планаў. Сярод іх — маленькая мара: хачу ўбачыць, як бусляняты вучацца лётаць. Сусед, які жыве ў вёсцы ўсё жыццё, кажа, што гэты момант ужо не за гарамі. Праз тыдзень, максімум два, птушаняты пачнуць вылятаць з бацькоўскага гнязда... Пакуль жа яны прагна цягнуцца цікаўнымі галоўкамі ў неба і нясмела размінаюць крылцы. Каб не прапусціць момант, штодня час ад часу спыняюся і назіраю за буслянятамі. За гэты час зрабіла для сябе столькі адкрыццяў! Напрыклад, касмічныя гукі, якія выдаюць бусляняты, я да гэтага лета ніколі не чула альбо проста не звяртала ўвагі. А яшчэ, аказваецца, у дзетак, у адрозненне ад дарослых буслоў, чорны колер дзюбы і ног.*

*Цяпер, дарэчы, вядзецца Нацыянальны ўлік белага бусла — 2024. У гэтым цудоўным праекце могуць прыняць удзел усе ахвотныя: трэба проста паведаміць на пошту busel2024belarus@gmail.com аб гнёздах буслоў, якія вы ведаеце. У прыватнасці, назву населенага пункта, колькасць буслянак у ім і на чым яны размешчаны (дрэва, дах, слуп, воданапорная вежа...), а таксама колькасць птушанят. Для больш дакладнага іх пераліку трэба дачакацца кармлення. Бо бусляняты, пакуль маленькія, часта хаваюцца ў гняздзе і паказваюць свае галоўкі, як правіла, толькі калі прылятаюць тата ці мама з ежай.*

*Апроч калекцыяніравання летніх уражанняў, я пакрысе раблю і матэрыяльныя нарыхтоўкі на зіму. Зварыла варэнне з сасновых шышак, збіраю і сушу мелісу, мяту, чабор, бергамот, мацярдушку са свайго міні-аптэкарскага агародчыка, духмяныя кветкі вясковай шыпшыны ды ліпы. У найбліжэйшых планах — ферментаваць самую маю любімую і такую карысную гарбату — скрыпень (іван-чай)...*

*Усе людзі розныя. У кагосьці шклянка часцей за ўсё напалову пустая, у кагосьці напалову поўная. У мяне таксама бываюць розныя дні, настрой. Але, тым не менш, стараюся быць пазітыўнай, думаць аб тым, што наперадзе яшчэ цэлых два месяцы лета, а далей бабіна лета... А наогул, калі задумацца, няма розніцы, якое надвор'е, калі побач дарагія сэрцу людзі, з якімі хочацца пражываць усе чатыры пары года.*

*...Летась цёплым жнівеньскім вечарам мы з сябрамі сядзелі ў нас на тэрасе. Алесь дастаў кнігу вышэйзгаданага Рэя Брэдберы «Лета, бывай». І зачытаў услых урывак з яе. «Жнівень трэба цадзіць павольна, як грушавы лікёр. Наліваць у маленькую чарачку, адсёрбваць па кропельцы, а скрозь чарачку глядзець на сонца. Жнівеньскія ночы трэба разводзіць агеньчыкамі свечак, малаком, налітым у каганец для дамавіка, муркатаннем ката і стракатаннем конікаў. Жнівеньскія дні трэба закладваць між старонак кніг, як закладкі, каб потым вытрасаць іх жар у золкім лістападзе, дастаўшы гэтую кнігу з паліцы. І заклінаю вас, ну не крычыце вы на ўсіх кутах: «Ой, вось і жнівень, вось і восень!» Ну куды вы спяшаецеся? Спыніце гадзіннік. Піце па кроплі».*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Мая гісторыя

# КАЛІ ЗМАЎКАЕ ПРЫРОДА, ПАЧЫНАЕ ПЛАКАЦЬ ЗЯМЛЯ...

## На жаль, усе, пра каго ідзе гаворка ў гэтым матэрыяле-ўспаміне, ужо сышлі ад нас

**ГІСТОРЫЯ маёй сям'і, маёй радні, якую я хачу расказаць чытачам, самая простая. Яе пазнаюць амаль усе сем'і, якіх у Беларусі на момант пачатку Вялікай Айчыннай вайны былі тысячы і тысячы. Праз прызму гэтай прыватнай гісторыі хачу данесці ўсім, хто вырас на аповедах блізкіх людзей пра вайну, хто гэтыя аповеды перадаваў сваім дзецям, а яны — сваім: не забывайце, нясіце праз час шчыры і праўдзівы летапіс сваіх сем'яў, сваёй радні, таму што з гэтых невялічкіх гісторый складалася агульная гісторыя Вялікай Перамогі і вялікіх пакут беларускага народа.**

### КІРДУНЫ

Нашы (дарэчы, у мяне больш за 40 стрыечных братоў і сясцёр) бабуля і дзядуля — Міхадзюк Алена Аляксееўна 1875 года нараджэння і Кірдун Тарас Захаравіч 1876 года нараджэння — павянчаліся ў царкве невялікай вёсачкі Крынка Бабруйскага павета Мінскай губерні ў маі 1895 года. Аселі ў вёсцы Птушычы таго ж павета. І пачалі сямейнае жыццё. Да пачатку Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі яны мелі статус моцных сераднякоў. Калі прыйшоў час раскулачвання, баяліся, што трапяць пад гэту кампанію: гаспадарка моцная, ёсць свая малатарня. Аднак баяліся дарэмна, бо ўсё рабілі саматугам, без парабкаў.

Ды і паважалі аднавяскоўцы Кірдуноў — за працавітасць, цярпенне і стаўленне да людзей. А яшчэ наша бабуля была павітухай — прымала і лячыла, лічы, усіх нованароджаных дзетак не толькі ў Птушычах, але і ў наваколлі.

Чацвёра сыноў і шэсць дачок — такая была спадчына Кірдуноў. Сваю малую радзіму пакінулі толькі двое: Рыгор і Іван.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*



Рыгор Волгін са сваёй сям'ёй яшчэ да вайны.

Духоўны свет

# «БО БЫЎ Я ХВОРЫ, І ВЫ ПРЫЙШЛІ ДА МЯНЕ...»

## Святар распавёў, навошта трэба дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу, і што такое сапраўдная дабрачыннасць

**ХРЫСЦІЯНСТВА і міласэрнасць — узаемазвязаныя паняцці. Дабрачыннасць заўсёды разглядалася любой хрысціянскай канфесіяй як неад'емны складнік жыцця, бо адлюстроўвае галоўныя прынцыпы вучэння аб любові да бліжняга. У праваслаўі справы міласэрнасці — адзін з найважнейшых кірункаў работы епархій у цэлым і кожнага прыхода паасобку. Пра тое, чаму важна дапамагаць бліжняму, каго лічыць бліжнім хрысціяніну і каму больш патрэбна гэта дапамога — таму, хто ў ёй мае патрэбу, ці таму, хто яе аказвае, гутарым з настаяцелем прыхода храма свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску святаром Аляксандрам Пальчэўскім.**



### ПРАЕКТЫ І ПРАГРАМЫ...

— Дабрачыннасць — велізарны пласт работы праваслаўнай царквы, якая вядзецца па многіх кірунках, — кажа айцец Аляксандр. — Існуе Сінаідальны аддзел царкоўнай дабрачыннасці — структура, якая каардынуе гэту работу. У нашай краіне дабрачынныя праекты ажыццяўляюцца як у рамках усёй Царквы, так і епархій, то-бок асобных рэгіёнаў Беларусі: у кожнай епархіі ёсць аддзел па сацыяльным служэнні, які займаецца арганізацыяй работ, звязаных са справамі міласэрнасці. Рэалізоўваюцца таксама праекты, якія датычацца асобных прыходаў. У сферы дабрачыннасці ажыццяўляецца ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі структурамі, падпісваюцца сумесныя пагадненні і праграмы з дзяржустановамі, медыцынскімі арганізацыямі, дзіцячымі прытулкамі, хоспісамі і гэтак далей. Але ёсць і праекты, якія Царква ўвасабляе ў жыццё самастойна.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

# Найлепшыя з найлепшых

## Даведаліся аб тым, чым сёння жывуць гаранты харчовай бяспекі

**КОНКУРС «Уладар сяла» стаў сапраўдным святам сямейных традыцый, магчымасцю для маладых людзей гучна заявіць пра сябе. Кожная сям'я ўнікальная. Расказаць хочацца пра ўсіх. Абласны этап на Міншчыне праходзіў у Крупскім раёне, на Камсамольскім беразе (зона адпачынку возера Сялява).**

Сюды прыбылі пераможцы раённых этапаў, каб даказаць, што ў цэнтральным рэгіёне Беларусі жывуць дружныя, актыўныя, творчыя, працавітыя і спартыўныя вяскоўцы, якія могуць усё. І бервяно распілаваць, і дроў насекчы, і паказаць «клас» у сельскіх забавах, і сталы накрыць так, каб ламіліся, і станцаваць і праспяваць ад душы, каб чуваць было ў суседняй вобласці.

«Шчыра вітаю вас на Крупскай зямлі, у гэтым маляўнічым кутку на найпрыгажэйшым возеры Сялява, — падтрымаў удзельнікаў **старшыня Крупскага райвыканкама Анатоль КОЗЕЛ.** — Праца хлебароба шанавалася ў розныя часы. Сёння вы як прадаўжальнікі традыцый продкаў вучыце сваіх дзяцей шанаваць хлеб, шанаваць гэтую працу. Вы сёння па праве з'яўляецеся гарантамі харчовай бяспекі нашай краіны».




Сям'я НАРУШЭВІЧ з Лагойскага раёна прадстаўляе свой падворак.

Асноўныя задачы сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла» — паказаць каларыт вясковай працы і побыту, а таксама павысіць ролю і значэнне сям'і як найважнейшага сацыяльнага інстытута грамадства. І гэтым разам абласны этап конкурсу прайшоў у найлепшых традыцыях: ад прадстаўлення падворкаў да спаборніцтваў на хуткаснае манеўраванне з садовымі тачкамі і спавіванне «дзяцей». Не абышлося, вядома, і без кулінарыі — румяных дранікаў на калодзе.

«Вельмі радуе, што з кожным годам папулярнасць конкурсу расце. Сёння можна сказаць, што ён стаў усё любімым, народным, маладзёжным, сямейным праектам, — адзначыла **першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Юлія МУРЫНА.** — У нашай краіне робіцца многае для падтрымкі сям'і, для захавання і ўмацавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. У нашых аграгарадках, пасёлках, вёсках жывуць таленавітыя і працавітыя, дужыя і надзейныя сем'і, сваім прыкладам паказваюць дзецям, як трэба любіць дом, малую радзіму і краіну. У вашых руках будучыня беларускай вёскі. Ад вас залежыць захаванне і прымнажэнне каштоўнасцяў нашых продкаў. 2024 год абвешчаны Годам якасці. Я жадаю, каб наш конкурс прайшоў на высокім, якасным узроўні. Хай пераможа наймацнейшы».

У конкурснай эстафеце «працуем у камандзе» сем'і праявілі майстэрства ў кіраванні тачкі, у забіванні цвікоў, спавіванні лялькі, зборы ўраджаю. Ручная піла праверыла, як муж і жонка ўмеюць зладжана дзейнічаць у дасягненні выніку. А затым колка дроў (выконваў мужчына) і іх складанне — тут ужо ўменне праяўляе жонка. Самым незвычайным заданнем шматлікія сем'і назвалі конкурс «на ўсе рукі майстар», падчас якога трэба было звязаць венік.

Дарэчы, 20 чэрвеня ў Мінскай вобласці было абвешчана анлайн-галасаванне, у якім вызначалі фаварытаў, галасуючы за прадстаўленыя сем'ямі візітоўкі. Пераможцам стала сям'я Грушаў з Клецкага раёна.

Яўген і Надзея Грушы пазнаёміліся ў 2018 годзе. Жанатыя з 2020 года. У сям'і чацвёра дзяцей. «Пражываем у вёсцы, вядзём гаспадарку, разводзім бараноў. У вёсцы таксама можна жыць, у нас ёсць і сучасныя хобі, і захапленні, а таксама сямейныя традыцыі, якія захоўваем. У цэлым, у нас дружная і моцная сям'я», — распавяла Надзея.



Смачныя дранікі ад сям'і ПАПІКЯН з Крупскага раёна.

«Пазнаёміліся па-сучаснаму — у перапісцы. Сустрэліся, папілі кавы, схадзілі ў рэстаран. Ну і пайшло-паехала. На працягу года зрабіў прапанову, і пажаніліся», — падзяліўся Яўген.

Маладая сям'я ўпершыню ўдзельнічае ў праекце. «Калі даведаліся пра «Уладара сяла», адразу сумняваліся. А потым падумалі і вырашылі: «А давай паспрабуем, мы што, горшыя?» Так і трапілі сюды», — сказалі маладыя.

Ад убачанага і перажытага эмоцыі зашкальваюць. Сям'я Грушаў папярэдне даведвалася аб праекце ў інтэрнэце, таму Яўген і Надзея ўжо мелі нейкае ўяўленне. «Гэта вельмі цікава, але калі ты сам трапляеш у гэтую атмасферу, адчуваеш усё, што тут адбываецца, — гэта вельмі здорава і ні з чым не параўнаецца. Мы лічым, што ў такіх мерапрыемствах павінна ўдзельнічаць як мага больш сем'яў. Гэта і зносіны з людзьмі, і новыя знаёмствы ды адкрыцці», — падзялілася ўражаннямі жонка.

Па словах сужэнцаў, сакрэт сямейнага шчасця просты: «Мы слухаем і чуем адно аднаго. Заўсёды абмяркоўваем праблемы. Нашы адносіны пабудаваны на павазе і ўзаемаразуменні».

Сям'я Папікян з Крупскага раёна ведае пра возера Сялява не па чутках. Яны не раз адпачывалі на гэтым цудоўным месцы. Разам маладыя людзі ўжо сем гадоў. Выхоўваюць пяцігадовую дачку. «Жывём проста, усяго ў нас хапае. Ёсць і цікавае хобі — усёй сям'ёй катаемся на матацыкле, ходзім у грыбы, ягады, на рыбалку. Працую я леснікам у Крупскім лясгасе. Праца мне па душы: у лесе, на прыродзе... Цяпер вучуся на зваршчыка, планую пайсці вучыцца на майстра, хачу набрацца вопыту. Стаўлю мэты і іду да іх. А самае галоўнае для мяне — клопат пра сям'ю», — распавёў мужчына.



І такія навыкі ў жыцці патрэбныя! Сям'я ШЭЎЧЫК з Любанскага раёна.

«Сакрэт у тым, што мы заўсёды размаўляем, разумеем адно аднаго. Часам трэба ўмець і прамаўчаць. У любой пары вельмі важныя вернасць, уменне абмяркоўваць праблемы і ісці на кампраміс», — падзялілася жонка.

Сям'я Папікян удзельнічае ў конкурсе ўпершыню. «Мы і раней задумваліся аб удзеле, але неяк справа не даходзіла. І вось усё ж такі адважыліся. Пагадзіліся не адразу, перажывалі, бо мерапрыемства — на высокім узроўні», — заключылі маладыя.

Пераможцам абласнога этапу стала сям'я Шыла з Барысаўскага раёна. Юлія і Дзмітрый разам з сынамі будуць прадстаўляць Міншчыну на спаборніцтвах рэспубліканскага ўзроўню, якія адбудуцца на свяце «Купалле» ў Александрыі.




Пераможцы праекта — сям'я ШЫЛА з Барысаўскага раёна.

«Не чакалі, што зоймем першае месца, — адзначыла Юлія. — Мы стараліся, хацелі выйграць, але тут столькі добра падрыхтаваных, прыгожых сем'яў!»

Дзмітрый і Юлія пазнаёміліся дзякуючы агульным сябрам. І вось ужо пяць гадоў маладыя жывуць у шчаслівым шлюбе. У сям'і Шыла двое дзяцей: Раману — чатыры гады, а Арсенію — усяго шэсць месяцаў.

«Удзельнічаць у такім маштабным праекце — вельмі хвалююча. Было цікава, як ацэняць журы. Напэўна, было складана выбраць, бо ўсе прыгожыя і добрыя па-свойму, у кожнай сям'і свая разыначка. Дарэчы, у 2022 годзе сям'я Тарасевічаў з нашага аграгарадка Лошніца заняла другое месца. Яны нас і падштурхнулі на ўдзел у гэтым конкурсе. Мне здаецца, што члены журы ацанілі нашу кампетэнтнасць, сабранасць, пачастункі, таму што ўсё рабілася сваімі рукамі, нічога пакупнога не было. Нашы смачныя дранікі, думаю, спадабаліся ўсім», — падзяліліся маладыя бацькі.

Іх сакрэт — у каханні. «Мы любім адно аднаго і паважаем. Муж працуе на трактары, таму менш знаходзіцца дома, сумуем. Самае галоўнае — клопат. Турбуйцеся адно пра аднаго, тады ўсё будзе добра. Мы клапоцімся пра дзяцей, дзеці — пра нас і адзін пра аднаго, таму мы шчаслівыя», — падагульніла сям'я Шыла.

«Мы настройваем іх толькі на перамогу! Усе хацелі, каб яны занялі першае месца і паехалі на рэспубліку. Гэта дастойная сям'я, і мы спадзяёмся, што ў Александрыі яны заваююць першае месца і чарговы раз дакажуць, што Мінская вобласць заўсёды наперадзе! — радуецца сям'я Тарасевічаў. — У 2022 годзе мы ўдзельнічалі ў рэспубліканскім этапе. Жывём у адным аграгарадку, працуем разам. Натхняем адно аднаго!»

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*Крупскі раён.*

# КАЛІ ЗМАЎКАЕ ПРЫРОДА, ПАЧЫНАЕ ПЛАКАЦЬ ЗЯМЛЯ...

## БРАТЫ

На памяці эпізод, які перадаецца ў нашай сям'і з вуснаў у вусны. Дзядзька Грыша, трапіўшы ў Маскву, вырашыў, што для афіцэра, які камандуе людзьмі, прозвішча Кірдун не вельмі мілагучнае, і... памяняў яго на Волгін. Мая мама расказвала, што дзядуля, даведаўшыся пра гэта, моцна разззлаваўся і гатовы быў не даравацьсыну да канца сваіх дзён. Але жыццё, дакладней, вайна, распарадзілася па-свойму.

Рыгор скончыў Мінскае пяхотнае вучылішча, у 1933 годзе паступіў на інжынерна-камандны факультэт ваенна-інжынернай акадэміі РСЧА імя Куйбышава, якую скончыў у 1937-м. Пасля заканчэння быў накіраваны на будаўніцтва Ржэўскага ўмацаванага раёна, пасля пераведзены на выкладчыцкую работу ў ваенна-інжынернае вучылішча, рыхтаваў сапёраў для інжынерных войскаў. Але ўсе гэтыя прыступкі Рыгор Тарасавіч прайшоў у даваенныя гады.

Калі грымнула Вялікая Айчынная, падаў рапарт аб адпраўцы яго на фронт. Так трапіў у дэсантныя войскі. Сёння мы беражліва захоўваем у сямейным архіве яго адзіны ліст з фронту і пахаванку з некалькімі лаканічнымі словамі: «Ваш сын загінуў смерцю адважных, пахаваны з вайсковымі ўшанаваннямі». А вось радкі з апошняга пісьма Рыгора Тарасавіча сваёй сям'і: «Добры дзень, дарагія мае Марыя, Шурык, Віця і бабуля! Больш за тыдзень я вам не пісаў. Я жывы, здаровы і па-ранейшаму ваюю. Апошнія дні было шмат работы, і я не меў часу напісаць. Вось ужо 36 дзён мы знаходзімся ў бесперапынных баях. За гэты час здолелі разбіць нямецкія полчышчы, якія рваліся да... (тут выкраслена цэнзурай), наступаем на Захад. Ужо рушылі наперад больш чым на 100 кіламетраў.

Мы прайшлі сотні вёсак, усе яны пустыя. Немцы пры адступленні ўвесь народ пагналі на Захад, але ім не ўдалося іх сагнаць. Штодня мы адбівалі гэтых пакутнікаў ад фашысцкіх катаў, і яны чарадамі вяртаюцца ў свае сёлы, цягнуць з сабой свой скарб. Вось і ўсе мае навіны. Уласна, навін шмат, іх у лісце не апісаць...»

Загінуў дзядзька Грыша практычна на зыходзе вайны, у лістападзе 1944 года, у Закарпацці ад рук бандэраўцаў. Ён — кавалер ордэнаў Чырвонай Зоркі і двойчы — Чырвонага Сцяга. Пахаваны ў Львове. Мы здолелі пабываць на яго магіле і прывезці адтуль жменьку зямлі, якую прыкапалі да магіл бабулі і дзядулі ў Дараганаве. Такім чынам, хоць маленькую часцінку яго апошняга месца спачыну вярнулі на радзіму. У дзядзькі цяпер ёсць невялікае надмагілле, у нас — магчымасць аддаваць яму даніну памяці значна часцей, чым гэта было раней.



Іван Кірдун.

Іван Тарасавіч Кірдун. Дзядзька Ваня. Мне пашчасціла з ім сустракацца, хоць і жыў ён не ў Беларусі, а ў падмаскоўным Пушкіне. Вялікую Айчынную сустрэў у 190-м зенітна-артылерыйскім палку СПА Каўказскай ваеннай акругі. Там атрымаў сваё першае званне старшыні. Затым былі курсы павышэння кваліфікацыі, прызначэнне на пасаду намесніка камандзіра батарэі па палітчастцы ў 513-м зенітна-артылерыйскім палку. А неўзабаве Івана Кірдуна прызначаюць намеснікам камандзіра дывізіёна па палітчастцы. Разам з байцамі ён выконваў важныя баявыя задачы па абароне стратэгічных нафтавых аб'ектаў Баку і Грознага. Супрацьпаветраная абарона была настолькі магутнай, што фашысцкія бамбавікі і блізка не маглі да іх падляцець. Пасля вайны Іван Тарасавіч скончыў ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна і доўгія гады аддаў службе ў арміі, скончыўшы сваю ваенную кар'еру ў званні палкоўніка. Сваёй грамадзянскай прафесіяй ён абраў выхаванне моладзі, якое і стала справай яго жыцця. За заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонай Зоркі і 12 медалямі. Дзядзька Ваня пражыў доўгае і насычанае жыццё, да апошняга вадзіў аўтамабіль і руль пакінуў бліжэй да 90 гадоў, калі стаў падводзіць зрок. Ён размяняў дзясяты дзясятак і пайшоў з жыцця...



Служба ў далёкіх краях.

Самы старэйшы з братоў Сцяпан Кірдун не пакідаў родных мясцін ніколі. Працаваў ляснічым да вайны, а ў Вялікую Айчынную ў гэтых жа лясах і партызаніў. Перад самым вызваленнем Беларусі ён захварэў на туберкулёз і неўзабаве памёр.

Дзядзька Арцём — Арцём Тарасавіч Кірдун. Ён змог скончыць толькі тры класы Дараганаўскай школы. Потым, каб дапамагаць бацьку па гаспадарцы, быў вымушаны пакінуць вучобу. Затым была служба ў войску, а пасля яе заканчэння, у 1927 годзе, аднавяскоўцы выбіраюць Арцёма Тарасавіча старшынёй камітэта беднаты. У 1932-м ён становіцца каля руля калгаса «Камінтэрн», якім і кіраваў да пачатку вайны. Як толькі фашысты прыйшлі ў Дараганава, Арцём Кірдун пайшоў у партызанскі атрад, дзе разам з братам Сцяпанам ваяваў супраць гітлераўцаў. Ён выйшаў жывым з гэтай вайны, заняў сваю ранейшую пасаду, затым узначаліў цагельню ў Шушараўцы Старадарожскага раёна. І, хто ведае, у якім бы напрамку пайшлі яго жыццё і кар'ера, але ён загінуў ад рук паліцаяў-недабіткаў, вяртаючыся дадому з работы праз лес.

## СЁСТРЫ

Завяршаючы аповед аб чатырох маіх дзядзьках, не магу не згадаць і той факт, што мая мама Марыя Тарасаўна часта і з вялікай цеплынёй успамінала іх. Яна казала аб тым, што менавіта Рыгор і Іван паўплывалі на яе лёс, літаральна прымусіўшы прадоўжыць адукацыю пасля школы. Яна паслухалася і потым не шкадавала аб гэтым ні хвіліны.

Сясцёр, як я ўжо казала вышэй, было шасцёра: Кацярына, Наталля, Ганна, Вера, Агрыпіна і Марыя — мая мама. Да пачатку вайны пяцёра сясцёр ужо былі замужам і мелі сваіх дзяцей. На фронт сваіх мужоў праводзілі двое з іх — Агрыпіна і Кацярына. Наталля разам з мужамі пайшлі ў партызанскую зону. Астатнія вымушаны былі застацца на акупаванай тэрыторыі, таму што на руках у іх былі маленькія дзеці.

Муж цёткі Агрыпіны загінуў у 1944 годзе ў Польшчы. На руках ва ўдавы засталіся не толькі трое маленькіх сыноў, але і паралізаваная свякроў. Працавала жанчына ў калгасе, дзе ў цяжкія пасляваенныя гады ўсё рабілася рукамі: ад сяўбы да ўборачнай (збожжавыя ўбіралі сярпом). А яшчэ дзеці, прыкаваная да пасцелі пажылая жанчына... Мусіць, дагляданне хворай свякрухі і вызначыла наступны выбар цёткі Агрыпіны — дапамагаць хворым і нямоглым. Яна стала працаваць у мясцовай Дараганаўскай бальніцы, адтуль і пайшла на заслужаны адпачынак. Трое сыноў падняліся, скончылі сярэднюю школу, і кожны абраў сабе справу па душы. Але толькі адзін, Аляксандр, пайшоў па шляху дзядзькаў і стаў вайскоўцам.

Цётка Каця, акрамя мужа, які з фронту вярнуўся інвалідам, на зыходзе вайны адправіла ваяваць свайго старэйшага сына Валодзю. Мне яна неяк расказвала, што, праводзячы яго на фронт, не плакала: «Я ж яго ваяваць праводзіла, а не паміраць». І сын вярнуўся дадому жывы і здаровы. Яна таксама ўсё жыццё працавала на калгаснай ніве. Як і цётка Вера, якая гадавала пяцярых дзяцей, і цётка Аня, у сям'і ў якой было чацвёра дзетак, і цётка Наташа, якая паднімала пяцярых.

Інакш склаўся лёс маёй мамы — той самай малодшай любіміцы дзядзькаў Грышы і Івана. Яна адзіная з усіх сясцёр атрымала адукацыю і ўсё жыццё працавала настаўніцай. У чэрвені 1941-га здавала выпускныя іспыты ў Мінску ўжо пад бамбёжкай. Падаліся яны з сяброўкай спачатку ў бок Масквы, але чырвонаармейцы іх развярнулі: «Куды вы? На верную пагібель?» — у тыя дні Маскоўскую шашу фашысты бамбілі асабліва жорстка. І дзяўчаты вырашылі ісці дадому, у Дараганава. На дарогу практычна не выходзілі, ішлі лесам, арыентуючыся па тэлеграфных слупах.

Але і дома страх не сыходзіў: баялася, што загоняць у Нямеччыну. Адзіным выйсцем было замужжа. Да вайны ў вёсцы стаяла падраздзяленне кавалерыйскай казацкай дывізіі, салдаты якой трапілі ў палон. Тады, у першыя тыдні вайны, палонных можна было выкупіць. І бабуля з мамай сабралі няхітры скарб: палатно, сала, іншыя прадукты і пайшлі дамаўляцца.



**1963 год. Мае стрыечныя сёстры і браты.
Злева — той самы Валодзя, які пайшоў на фронт пасля вызвалення Беларусі і, на шчасце, вярнуўся дамоў жывым,
а дзіця на руках — аднагадовы будучы аўтар «Звязды» і гэтага артыкула.**

Мужам мамы стаў прыгажун Павел, кубанскі казак. Разам яны пайшлі ў партызанскую зону. А праз год ці крыху больш мая мама стала ўдавой. У 1943 годзе там жа, у партызанскай зоне, у яе нарадзіўся сын Рыгор. І пачалася блакада. Пекла наяве. Ратавацца ад карнікаў можна было толькі ў балотах. Жанчыну з груднічком гналі адусюль: раптам хлопчык закрычыць, раптам выдасць?.. Але немаўля, нібы разумеючы, што ад яго залежыць жыццё дзясяткаў людзей, маўчала. Седзячы па шыі ў балотнай жыжцы, мама падымала і трымала на выцягнутых руках самы дарагі скрутак у яе жыцці... Але ўсё ў рэшце рэшт скончылася. Пасля вызвалення Беларусі мама сустрэлася з балбатуном-веселуном Емяльянам Шурпачом — падпольшчыкам, журналістам, які са сваімі таварышамі на востраве Зыслаў выдаваў газету «Звязда». І яны пажаніліся. Жыццё пайшло сваёй чарадой...

## ПАТАЕМНАЕ

Я глядзела шмат фільмаў пра вайну. І Перамогу паводле іх запомніла такой: радасць, сустрэчы, кветкі і яркае сонечнае святло... Але мама мне распавядала зусім іншую гісторыю: «Ой, дачушка, што рабілася, як людзі крычалі, як плакалі ўголас». — «Чаму, гэта ж радасць, гэта ж перамога?» Пасталеўшы, зразумела: прыбраныя цяплушкі, абдымкі і ўсеагульная радасць былі потым. А першым прыйшоў боль. Невыносны і нечалавечы. Так можа балець душа ад вялікага гора і вялікай несправядлівасці. За тых, хто не дажыў, хто не пачуў гэтае самае жаданае, выпакутаванае слова.

Мая радзіма, Дараганаўская зямля, літаральна працятая гэтым болем: у мясцовым гета былі закатаваны і забіты 162 яўрэі. Сто метраў ад нашай хаты — і вось яно, месца трагедыі. Таму мае суседкі, у вайну яшчэ падлеткі, усё бачылі і чулі, і разумелі. Гэта яны мне расказалі, што некалькі сутак зямля на месцы расстрэлу стагнала і варушылася.

У дараганаўскім лесе ёсць яшчэ адна брацкая магіла — там пахаваны 84 дзіцяці. У чэрвені 1941-га іх прывезлі на лячэнне ў санаторый. Забраць не паспелі. З санаторыя фашысты зрабілі дзіцячы канцлагер. Суровую зіму 1941 года дзеці сустрэлі ў тым, у чым заспелі іх фашысты — лёгенькай піянерскай форме. У красавіку 1942-га іх, а таксама дзетак яўрэяў, якіх сабралі па акрузе, расстралялі. Па дарозе да пакарання збег у лес толькі адзін хлопчык.

...Я не раз заўважала, як сярод вясёлага летняга рознагалосся ў Дараганаве раптам надыходзіць поўная цішыня. Не, не тая цішыня, ад якой заплюшчваеш вочы і ўсміхаешся проста так. Ад гэтай цішыні хочацца бегчы на край свету. Яна трывожная і страшная. Напэўна, заціхаючы, прырода дае час выплакаць свае слёзы сырой зямліцы, якая ўвабрала ў сябе сотні нявінных чалавечых жыццяў. Гэтыя слёзы не скончацца ніколі. Як і не скончыцца наша памяць, пакуль мы жывыя.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

**Матэрыялы і фота з сямейнага архіва прадставіў мой брат, Аляксандр ПАДЭРА, сын загінулага франтавіка, палкоўнік запасу.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



# «БО БЫЎ Я ХВОРЫ, І ВЫ ПРЫЙШЛІ ДА МЯНЕ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Якія кірункі дабрачыннай дзейнасці сёння найбольш актыўна развівае праваслаўная царква?***

— Кірункаў мноства. Гэта дапамога і маламаёмасным, і дзецям-сіротам, і пажылым людзям, і шматдзетным сем'ям, і людзям з пэўнымі захворваннямі. Так, напрыклад, сёння пры праваслаўнай царкве створаны і працуюць шэраг цэнтраў па супрацьдзеянні алкагалізму. Пры Царкве ёсць арганізацыя, якая займаецца менавіта гэтым. Толькі ў Мінску некалькі святароў прысвяцілі жыццё такому аспекту сацыяльнага служэння. Тое ж самае датычыцца супрацьдзеяння наркаманіі. Людзям, якія сталі на шлях барацьбы з гэтымі сацыяльнымі хваробамі, аказваецца і медыцынская, і матэрыяльная дапамога, і духоўная падтрымка. Царква дапамагае бяздомным. У апошнія месяцы ў Мінску збіраюцца сродкі на аўтобус міласэрнасці, транспарт для наведвання бальніц, дамоў-інтэрнатаў, хоспісаў і іншых устаноў, у тым ліку для дастаўкі дабрачыннай дапамогі і аказання транспартных паслуг маламабільным людзям.

**Насамрэч, нашы суграмадзяне вельмі актыўна рэагуюць на справы міласэрнасці. У тым ліку моладзь.**

Яшчэ адзін важны кірунак дзейнасці — работа з глухімі і са слабым слыхам людзьмі. У Мінску, у Фрунзенскім раёне, ёсць прыход святога пакутніка Уладзіміра Хіраскі: прыход займаецца духоўным акармленнем невідушчых людзей, і там ажыццяўляецца шмат сацыяльных праектаў. Нават сам храм уладкаваны так, каб людзям, пазбаўленым зроку, было ў ім камфортна. Напрыклад, там маюцца спецыяльныя іконы, якія можна «разглядаць» дакрананнямі. Ёсць у нашай краіне і святары, якія прайшлі навучанне для работы з глухімі і са слабым слыхам людзьмі: яны могуць здзяйсняць богаслужэнні з дапамогай жэстаў. Вядзецца пастаянная работа і для людзей з іншымі абмежаваннямі і захворваннямі. Напрыклад, ёсць святар, які замацаваны за дзіцячым анкалагічным хоспісам. А ў цэлым з людзьмі з ракавымі захворваннямі працуе прыход іконы Багародзіцы «Усецарыца» — здзяйсняюцца малебны і прычашчэнні, збіраюцца сродкі на абсталяванне.

## ЛЮДЗІ АДГУКАЮЦЦА ЗАЎСЁДЫ

***— Ці падтрымлівае Царква ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і ў цэлым пажылых людзей?***

— Падтрымка пажылых людзей — адзін з пастаянных кірункаў работы Царквы як на ўзроўні епархій, так і кожнага храма паасобку. Канкрэтна ў нашым прыходзе ёсць група валанцёраў, каля 40 чалавек, — гэта вернікі, якія ўцягнуты ў працэс дабрачыннасці. Мы ведаем усіх нашых прыхаджан і тое, хто ў чым мае патрэбу. У полі нашай увагі — пажылыя людзі і інваліды, якія заўсёды могуць патэлефанаваць у храм, каб мы прывезлі ім лекі. Калі людзі, нямоглыя па ўзросце, або тыя, што маюць абмежаванні па стане здароўя, жадаюць прыехаць у храм на богаслужэнне, мы арганізуем для іх такія паездкі. Яшчэ адзін наш сталы клопат — дзеці. Мы ўзаемадзейнічаем з Цэнтрам карэкцыйнага развіцця ў Заслаўі, дзе выхоўваюцца дзеці з асаблівасцямі. Наведваем іх рэгулярна, не адзін і не два разы на год, а нашмат часцей. Віншуем са святамі, праводзім майстар-класы, прывозім падарункі, аказваем дапамогу.

***— А чым у плане дабрачыннасці ваш прыход займаецца непасрэдна цяпер?***

— У Заслаўі, дзе выхоўваюцца дзеці з абмежаваннямі, на лета арганізоўваецца дзіцячы лагер, і апошні тыдзень мая мы збіралі для іх усё неабходнае. У гэтым удзельнічалі прыхаджане. І нават людзі, якія звычайна наш храм не наведваюць, — калі даведваліся пра гэты збор, актыўна падключаліся. Працуем таксама з Асацыяцыяй маці дзяцей з абмежаваннямі. З гэтай арганізацыяй узаемадзейнічаем увесь час, і такое супрацоўніцтва вельмі плённае: мы дапамагаем ім, а яны шмат у чым — нам, падтрымліваюць і многаму вучаць. Адрасная дапамога ў нас не спыняецца. Людзі пастаянна расказваюць пра тых, хто мае патрэбу, прыхаджане звяртаюцца з пытаннямі і просьбамі.

***— Вы расказалі пра вернікаў-валанцёраў у вашым храме. Такім чынам, дапамога адбываецца, па сутнасці, на грамадскіх пачатках?***



— Так, а мы гэта толькі каардынуем. Плануем, куды паехаць, абвяшчаем, што будзе паездка ці збор, і людзі падключаюцца...

***— Матэрыяльная дапамога ці дапамога прадуктамі збіраецца заўсёды? Ці здараецца, што людзі не спяшаюцца адгукацца на заклік?***

— У маёй практыцы такога не было. Наадварот, самыя розныя людзі адгукаюцца вельмі актыўна. Бывае, збіраем нават больш, чым першапачаткова планавалі. Аднойчы прыехалі ў дзіцячы прытулак і прывезлі столькі дапамогі, што там развялі рукамі: нам столькі не трэба... Насамрэч, нашы суграмадзяне вельмі актыўна рэагуюць на справы міласэрнасці. У тым ліку моладзь. У апошнія гады мы праводзім такія акцыі са студэнтамі лінгвістычнага ўніверсітэта (МДЛУ), і гэта выдатная магчымасць размаўляць пра запаведзі, пра каштоўнасці хрысціянскія і агульначалавечыя — праз валанцёрства і добрыя справы. Адна справа — слухаць пропаведзь, якая можа ўспрымацца моладдзю як павучанне, і зусім іншая — саміму далучыцца да канкрэтнай добрай справы.

## ВЫЙСЦІ ЗА РАМКІ СЯБЕ САМОГА

***— Чаму людзі хочуць дапамагаць бліжняму? Што імі рухае? Яны ж трацяць сілы, час, грошы на дапамогу малазнаёмым...***

— Евангелле дае нам дзве найважнейшыя запаведзі — любоў да Бога і любоў да бліжняга. Гэта аснова, падмурак хрысціянскага жыцця. Без іх хрысціянін не зможа рэалізаваць свой унутраны патэнцыял. Ды і любы чалавек, незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці, мне здаецца, адчувае нейкую першапачатковую ўнутраную патрэбу дапамагаць тым, хто апынуўся ў няпростай жыццёвай сітуацыі. Ведаеце, бывае, мы запрашаем людзей прыняць удзел у справах міласэрнасці, і яны кажуць: а мы чакалі, каб да нас нехта звярнуўся з такой прапановай. Прынята лічыць, што ў сучасным свеце чалавек эгаістычны, але гэта зусім не так. Іншая справа, што нярэдка людзі нібы саромеюцца праяўляць лепшыя якасці. Але насамрэч вельмі многія шукаюць магчымасць рэалізаваць сваё прызначэнне ў справах дабра, любові і міласэрнасці. Выкажу і яшчэ адно назіранне: таму, хто дапамагае, гэта значна больш патрэбна, чым таму, для каго ён здзяйсняе добрую справу. У кожным з нас закладзена жаданне выходзіць за рамкі самога сябе. Іаан Залатавуст казаў: «Нішто так не прыпадабняе нас да Бога, як дабрачыннасць». Калі мы зводзім сваё быццё да самога сябе, калі засяроджваемся толькі на ўласным жыцці і матэрыяльным камфорце, наносім шкоду сваёй душы. На ўзроўні свядомасці гэта праяўляецца псіхалагічным дыскамфортам, беспадстаўным засмучэннем і трывогай, цьмяным адчуваннем «я жыву няправільна». Імкненне да любові да бліжняга закладзена ў прыроду чалавека.

***— Ці казаў пра дабрачыннасць і міласэрнасць Хрыстос?***

— Пра гэта Ён казаў вельмі шмат. Але самая вядомая прытча на гэтую тэму — пра міласэрнага самарыцяніна. Гасподзь кажа: палюбі бліжняга як самога сябе. І ўзнікае пытанне: пра каго ж гаворка? «Бліжнія» — гэта мая сям'я і родныя? Ці дальнія сваякі таксама? Гэта сябры? Знаёмыя? Гэта людзі, якія добрыя да мяне, — і я раблю дабро ім у адказ? Адказваючы, Гасподзь расказаў прытчу. Ішоў адзін чалавек з Іерыхона ў Іерусалім, па дарозе на яго напалі разбойнікі, абрабавалі і збілі. Ён ляжаў і не мог устаць. Міма прайшоў святар і не дапамог. Прайшоў лявіт і таксама не спыніўся. Але праходзіў міма самарыцянін. Гэта быў чалавек іншай нацыянальнасці, больш за тое, паміж іўдзеямі і самарыцянамі існавала варожасць. І, нягледзячы на тое, што гэта былі людзі з розных рэлігійных і нацыянальных груп, якія знаходзіліся ў супрацьстаянні, самарыцянін адвёз іўдзея ў гасцініцу і зрабіў усё неабходнае для аднаўлення яго здароўя. Ён пакінуў гаспадару гасцініцы грошы і паабяцаў пакрыць выдаткі на лячэнне гэтага няшчаснага, калі яны тую суму перавысяць. Такі прыклад прывёў Гасподзь, кажучы, што бліжнім для хрысціяніна з'яўляецца кожны чалавек, сустрэты на жыццёвым шляху, незалежна ад яго рэлігіі, нацыянальнасці і поглядаў. Евангелле заклікае чалавека да здзяйснення спраў міласэрнасці. А прытча пра самарыцяніна выяўляе саму сутнасць дабрачыннасці. Чалавек часта здзяйсняе дабро і мае прыхільнасць да таго, хто здзяйсняе падобнае ў адносінах да яго. Але ўсё ж хрысціянін пакліканы да нечага большага. Хрысціянін пакліканы праяўляць сваю любоў да ўсіх людзей — нават да тых, хто да нас абыякавы ці дрэнна ставіцца.

***— А як правільна дапамагаць людзям? Бо бываюць сітуацыі, калі няправільная дапамога можа прынесці чалавеку не карысць, а шкоду...***

— Важна зразумець і адчуць, што адбываецца з чалавекам, які да вас звярнуўся, і як яму можна сапраўды дапамагчы. Часам здараецца, што чалавек злоўжывае вашым добрым да яго стаўленнем. Бываюць, напрыклад, выпадкі, калі да нас у прыход звяртаюцца па матэрыяльную дапамогу, і мы кажам: у нас цяпер вядзецца будаўніцтва храма і заўсёды ёсць патрэба ў яшчэ адной пары рук. Прыміце ўдзел у працы, а мы вам аддзячым грашыма. І часам людзі адмаўляліся ці нават уцякалі. Ёсць выпадкі, калі, каб здзейсніць акт міласэрнасці, трэба пазнаёміцца з чалавекам і зразумець яго сітуацыю.

***— Людзі часам здзяйсняюць добрыя ўчынкі ў надзеі на ўзнагароду — з Нябёсаў або ад тых, каму яны робяць дабро. Наколькі ў справах міласэрнасці важная матывацыя?***

— Такі падыход хрысціянства лічыць няправільным. Хрысціянін пакліканы рабіць дабро і нічога не чакаць узамен. Але часам людзі ўпэўнены, што калі яны зрабілі некаму дабро, то пасля гэтага ім усе павінны. Добрая справа ад гэтага не мяняе сваёй сутнасці — яна застаецца добрай. Пытанне ў іншым: якую духоўную карысць атрымае для сябе той, хто яе здзейсніў. З аднаго боку, нават самы прадуманы і патрэбны сацыяльны праект можа быць выканаваны фармальна, калі не ўкласці ў яго душу. З іншага, як я ўжо казаў, для таго, хто дапамагае, яго міласэрнасць важнейшая і больш патрэбная, чым для адрасата яго дапамогі. І каб добрая справа прынесла духоўнае заспакаенне і прасвятленне таму, хто яе здзяйсняе, вельмі важна ўнутранае напаўненне гэтага ўчынку. Гасподзь, здзяйсняючы ацаленне, імкнуўся змяніць у першую чаргу ўнутраны свет чалавека. Бо «якая карысць чалавеку, калі ён набудзе свет, а душы сваёй пашкодзіць» (Мф. 16:26). Любыя сацыяльныя праекты губляюць сэнс, калі яны не датычацца самага галоўнага — нашай душы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# УВАГА! ПАСТУПАЕМ!

Учреждение образования
**«ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ П. О. СУХОГО»**

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2024 ГОДУ

за счет средств республиканского бюджета

План приема лиц для получения научно-ориентированного образования на 2024 год

| Шифр специальности | Аспирантура | | | | Докторантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Всего | Из них по форме обучения | | | Всего | Из них по форме обучения | |
| | | Дневная | Заочная | Соискательство | | Дневная | Соискательство |
| 05.02.02 – машиноведение, системы приводов и детали машин | 5 | 2 | 2 | 1 | - | - | - |
| 05.02.09 – технологии и машины обработки давлением | 2 | - | - | 2 | | | |
| 05.14.01 – энергетические системы и комплексы | - | - | - | - | 1 | - | 1 |
| 05.13.05 – элементы и устройства вычислительной техники и систем управления | 2 | 2 | - | - | - | - | - |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| 25.02.05 – разработка и эксплуатация нефтяных и газовых месторождений | 3 | - | 3 | - | - | - | - |
| **Итого** | **13** | **5** | **5** | **3** | **1** | **-** | **1** |

Также осуществляется прием в аспирантуру и докторантуру на обучение за счет средств юридических и физических лиц по всем открытым в университете 11 специальностям.

**Прием документов** с 1 августа по 30 сентября 2024 г.

по адресу: г. Гомель, пр. Октября, 48, кабинет 1-601, тел. 8 (0232) 29 59 18 (http://www.gstu.by)

УНП 400073500

Учреждение образования
«ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2024 ГОДУ

в соответствии с контрольными цифрами приема для получения научно-ориентированного образования за счет средств республиканского бюджета по следующим специальностям:

| Шифр и наименование специальности | АСПИРАНТУРА | | | | ДОКТОРАНТУРА |
|---|---|---|---|---|---|
| | Всего | Из них по форме обучения | | | |
| | | Дневная | Заочная | Соискательство | Дневная |
| 05.02.08 – технология машиностроения | 1 | 1 | - | - | - |
| 05.02.13 – машины, агрегаты и процессы (легкая промышленность) | 1 | 1 | - | - | - |
| 05.13.06 – автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (легкая промышленность) | 3 | 3 | - | - | - |
| 05.19.01 – материаловедение производств текстильной и легкой промышленности | 1 | - | 1 | - | - |
| 05.19.02 – технология и первичная обработка текстильных материалов и сырья | 5 | 4 | - | 1 | 2 |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности) | 3 | 3 | - | - | 1 |
| **Всего** | **14** | **12** | **1** | **1** | **3** |

УНП 300031282

Также осуществляется прием в аспирантуру и докторантуру за счет средств юридических и физических лиц.

**Документы для поступления принимаются с 01 августа по 30 сентября 2024 года.**

Полную информацию можно получить по адресу:
**210038, г. Витебск, Московский пр-т, 72, каб. 214, тел. 8 (0212) 49-53-21.**

Подробности на сайте: **https://vstu.by**

Учреждение образования
«ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА 2024 ГОД

за счет средств республиканского бюджета

| Шифр | Специальность | Дневная | Заочная |
|---|---|---|---|
| **АСПИРАНТУРА** | | | |
| 01.04.02 | Теоретическая физика | 1 | – |
| 03.02.01 | Ботаника | 1 | – |
| 08.00.01 | Экономическая теория | 1 | – |
| 10.02.02 | Русский язык | 2 | – |
| 13.00.04 | Теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры | 1 | – |
| 19.00.01 | Общая психология, психология личности, история психологии | 1 | – |
| 19.00.05 | Социальная психология | 1 | – |
| | | соискательство | |
| 19.00.07 | Педагогическая психология | 2 | |

Дополнительный набор на специальности: 01.01.01, 01.04.03, 03.02.08, 05.13.15, 05.13.18

*Подготовка аспирантов осуществляется и на платной основе.*

**Прием документов с 1 по 30 сентября 2024 г.**

**г. Гомель, ул. Советская, 104, корпус 4, кабинет 4-6**

**Зачисление в аспирантуру – 1 ноября 2024 г.**

Подробная информация **по тел. 8 (0232) 510096** или на сайте университета **www.gsu.by**

УНП 400011099

Учреждение образования
«Белорусский государственный аграрный технический университет»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ В 2024 ГОДУ

по следующим специальностям:

| СПЕЦИАЛЬНОСТИ | План приема | | |
|---|---|---|---|
| | Форма получения образования | | |
| | Дневная | Заочная | Соискательство |
| 05.20.01 – технологии и средства механизации сельского хозяйства | - | 2 | 1 |
| 05.20.02 – электротехнологии и электрооборудование в сельском хозяйстве | - | 1 | - |
| 05.20.03 – технологии и средства технического обслуживания в сельском хозяйстве | - | 1 | 1 |
| 05.13.06 – автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (по отраслям) | - | 1 | 1 |
| 05.14.08 – энергоустановки на основе возобновляемых видов энергии | - | 1 | - |
| 05.18.12 – процессы и аппараты пищевых производств | | 1 | 1 |
| 05.26.01 – охрана труда (по отраслям) | - | 1 | - |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности) | - | 1 | - |
| 06.01.04 – агрохимия | | | 1 |

**Прием документов – с 1 августа по 30 сентября 2024 г.**

**Вступительные экзамены по специальности – с 10 по 21 октября 2024 г.**

**Начало занятий – 1 ноября 2024 года.**

Адрес приемной комиссии:
220012, г. Минск,
пр-т Независимости, 99, к. 5-1,
каб. 504, 529
(тел. 8-017-385-91-07,
8-017-373-34-74)

УНП 100185315

Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ»

## ПЛАН ПРИЕМА В АСПИРАНТУРУ БГУИР в 2024 году

### НА БЮДЖЕТНУЮ ФОРМУ ОБУЧЕНИЯ ПО СЛЕДУЮЩИМ СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

| *Шифр и название специальностей* | *Дневная форма обучения* | *Заочная форма обучения* | *Соискательство* |
|---|---|---|---|
| **АСПИРАНТУРА** | | | |
| 01.04.03 Радиофизика | - | 1 | - |
| 01.04.04 Физическая электроника | 1 | - | - |
| 01.04.07 Физика конденсированного состояния | 1 | - | - |
| 05.11.17 Приборы, системы и изделия медицинского назначения | 1 | - | - |
| 05.12.04 Радиотехника, в том числе системы и устройства телевидения | 1 | - | 1 |
| 05.12.07 Антенны, СВЧ-устройства и их технологии | - | 1 | 1 |
| 05.12.13 Системы, сети и устройства телекоммуникаций | 1 | - | 1 |
| 05.12.14 Радиолокация и радионавигация | 2 | - | - |
| 05.13.01 Системный анализ, управление и обработка информации | 1 | 2 | 3 |
| 05.13.05 Элементы и устройства вычислительной техники и систем управления | 1 | 1 | 1 |
| 05.13.06 Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами | 1 | 1 | - |
| 05.13.10 Управление в социальных и экономических системах | - | 1 | - |
| 05.13.11 Математическое и программное обеспечение вычислительных машин, комплексов и компьютерных сетей | 2 | - | 1 |
| 05.13.15 Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети | 2 | 2 | 2 |
| 05.13.17 Теоретические основы информатики | 2 | 1 | 1 |
| 05.13.18 Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ | - | 2 | - |
| 05.13.19 Методы и системы защиты информации, информационная безопасность | 2 | 2 | 2 |
| 05.16.08 Нанотехнологии и наноматериалы (физико-математические и технические науки) | 3 | - | - |
| 05.27.01 Твердотельная электроника, радиоэлектронные компоненты, микро и наноэлектроника, приборы на квантовых эффектах (физико-математические и технические науки) | 4 | 2 | 2 |
| 05.27.06 Технология и оборудование для производства полупроводников, материалов и приборов электронной техники | 1 | 1 | 1 |
| 08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством | - | - | 1 |
| 08.00.13 Математические и инструментальные методы экономики | 1 | - | - |
| **ИТОГО:** | **27** | **17** | **17** |
| **ДОКТОРАНТУРА** | | | |
| 05.11.17 Приборы, системы и изделия медицинского назначения | 2 | - | - |
| 05.13.17 Теоретические основы информатики | 2 | - | - |
| 05.16.08 Нанотехнологии и наноматериалы – (физико-математические и технические науки) | 1 | - | - |
| 05.27.06 Технология и оборудование для производства полупроводников, материалов и приборов электронной техники | 1 | - | - |
| **ИТОГО:** | **6** | **-** | **-** |

**Лица, поступающие в аспирантуру на конкурсной основе, должны иметь:**

- ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ;
- склонность к научным исследованиям, что подтверждается научными публикациями, участием в научно-исследовательских и инновационных проектах, конференциях или другими материалами;
- рекомендацию ученого совета учреждения высшего образования или факультета этого учреждения (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования;
- удостоверение о сдаче кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам.

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы бакалавриата.

Лица, не прошедшие по конкурсу на обучение за счет средств республиканского бюджета, получившие на вступительном экзамене оценку не ниже чем «четыре», имеют право участвовать в конкурсе на обучение в аспирантуре на платной основе.

*Срок обучения в аспирантуре не должен превышать в дневной форме – 3 года, в заочной – 4 года, в форме соискательства – 5 лет.*

Адрес: 220013, Минск, ул. П. Бровки, д. 4,
2-й уч. корпус, ауд. 410.
Телефоны для справок: 293-21-06; 293-23-34.
e-mail: otdaspir@bsuir.by

УНП 100363945

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

**Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)**

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона), оператор ЭТП** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Банк «РЕШЕНИЕ», УНП 100789114, ул. Игнатенко, д. 11, г. Минск, 220035, +375 17 369 73 88 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Изолированное помещение (торговое помещение) № 9, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Строителей, 28-9, общая площадь: 661, 7 кв. м, инв. № 610/D-73411 | 1 087 876,74 |
| **2** | Изолированное помещение (торговое помещение) № 12, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Строителей, 28-12, общая площадь: 510,9 кв. м, инв. № 610/D-73412 | 839 951,96 |
| **3** | Помещение транспортного назначения – верхний ярус (машино-место) (№№ 2, 3), расположенное по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 126-1, доля 2/48 в общ. пл. 1 564,40 кв. м | 31 056,58 |
| **4** | Помещение транспортного назначения – средний ярус (машино-место) (№№ 63, 84), расположенное по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 126-2, доля 2/44 в общ. пл. 1 517,40 кв. м | 29 370,48 |
| **5** | AT04373, комплект для установки зажигания французских автомобилей, Тайвань (11 шт.) | 1 174,58 |
| **6** | AT04637, набор съемников с сепаратором, 2 комплекта, Тайвань (20 комплектов) | 1 068,20 |
| **7** | 87380, диск алмазный сплошной, 180 x 2,2 x 22,2 мм, Польша (50 шт.) | 339,50 |
| **8** | ITQ07127, набор комбинированных ключей 12 пр. (6, 8, 10, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 22 мм), Индия (20 наборов) | 308,20 |
| **9** | 46461, тент, 110 г/м², 6 x 10 м, Польша (6 шт.); 46481, тент, 110 г/м², 8 x 12 м, Польша (3 шт.); 79R356, тент, 80 г/м², 4 x 6 м, Китай (10 шт.) | 581,39 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % процентов от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 5 (пять) дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение:
**по лотам 1–4 –** 0,5 % от цены продажи лота, в случае, если конечная цена продажи предмета аукциона от 500 тыс. бел. руб., 1 % от цены продажи лота, в случае, если конечная цена продажи предмета аукциона до 500 тыс. бел. руб., но не менее 200,00 бел. руб.;
**по лотам 5–9 –** 2 % от цены продажи лота, но не менее 50,00 бел. руб.; в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 29.07.2024 начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 26.07.2024 г. до 15.00. |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| 26.07.2024 13.00 | Продажа жилого дома. с инв. № 600/С-58737, по адресу: Минская обл., Минский р-н. Ждановичский с/с, д. Дегтярёвка, ул. Молодежная, д. 14 | 40 000 | 43,6 кв. м | 10 | 90 |
| 26.07.2024 11.00 | Продажа квартиры с инв. № 615/D-8286, по адресу: Минская область, Червенский район. Валевачский с/с, д. Гребёнка, пер. Первый, д. 5, кв. 5 | 8000 | 67,0 кв. м | 10 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск. ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращается за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22.

Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденными приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 171-50-50

УНП 193734126

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Гомельлён» (продавец) извещает о проведении 30 июля 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия продажи**:1) осуществление покупателем предпринимательской деятельности, ремесленной деятельности либо деятельности, при осуществлении которой физические лица, не осуществляющие предпринимательскую деятельность, уплачивают единый налог, или в случае приобретения недвижимого имущества некоммерческими организациями – деятельности некоммерческих организаций (далее – деятельность), с использованием приобретенного недвижимого имущества не мене трех лет, начиная не позднее 12 месяцев с момента заключения договора купли-продажи. В случае использования права сноса отдельных объектов, входящих в состав приобретенного недвижимого имущества, которые не могут быть использованы покупателем для осуществления деятельности, осуществить их снос в течение одного года с момента заключения договора купли-продажи; 2) в случае использования права сноса приобретенного недвижимого имущества и строительства нового объекта для осуществления деятельности завершить его строительство не позднее двух лет с момента заключения договора купли-продажи и использовать построенный объект для осуществления деятельности не менее трех лет с момента ввода его в эксплуатацию; 3) в случае необходимости проведения реконструкции приобретенного недвижимого имущества обеспечить завершение строительно-монтажных работ по его реконструкции не позднее двух лет с момента заключения договора купли-продажи, использовать реконструированный объект для осуществления деятельности не менее трех лет с момента ввода его в эксплуатацию. Покупатель имеет право на снос отдельных объектов, входящих в состав приобретенного недвижимого имущества, которые не могут быть использованы им для осуществления деятельности; 4) не допускается залог приобретенного недвижимого имущества, а также удовлетворение за счет него требований кредиторов в процессе экономической несостоятельности (банкротства) до выполнения покупателем обязательных условий договора купли-продажи. До истечения срока выполнения обязательного условия аукциона с начальной ценой, равной одной базовой величине, допускается отчуждение покупателем недвижимого имущества по согласованию с Продавцом, а также отчуждение такого имущества в процессе исполнения исполнительного документа или ликвидации покупателя с сохранением обязательств по выполнению данного обязательного условия за новым покупателем. При этом на нового покупателя распространяется ограничение, установленное в пункте четыре | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-32776**, общей площадью **149,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, без материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада. Адрес: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, пр-д Луговой, 1/8. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321255700001000592** общей площадью **0,1552 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Добрушский р-н., Тереховский с/с., г. п. Тереховка, пр-д Луговой, 1/8. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания склада (№ 11) | **48,00** | 9,60 |

У нашых найбліжэйшых суседзяў усе гэтыя тэндэнцыі відавочныя. Так, сітуацыю з правамі чалавека ў Літве аўтары даклада характарызуюць як неспрыяльную, але і яна няўхільна прадаўжае пагаршацца: «У краіне па-ранейшаму адзначаюцца шматлікія выпадкі абмежавання свабоды выказвання думак, дыскрымінацыі нацыянальных меншасцяў, перш за ўсё ў адукацыйнай сферы, праявы ксенафобіі і антысемітызму, праследаванні па палітычных і іншых матывах, а таксама праслаўленне нацызму і ашалелая русафобія».

Негатыўны стан спраў ускладняе сур'ёзны эканамічны крызіс, які праявіўся не толькі ў Літве, але і ў іншых прыбалтыйскіх дзяржавах. «Макраэканамічныя паказчыкі трох краін апошнім часам імкліва зніжаюцца. Яны аказаліся сярод лідараў ЕС па спадзе ВУП і прамысловай вытворчасці. Акрамя гэтага, мясцовае насельніцтва зведвае на сабе рэзкае падаражанне асноўных тавараў і паслуг, рост камунальных тарыфаў і высокую інфляцыю», — адзначаецца ў дакуменце.

Літоўскія ўлады выкрыты ў рэабілітацыі бандытаў, забойцаў і нацыстаў. Сярод іх — «лясныя браты» (у літоўскай інтэрпрэтацыі — «партызаны»). Іх прадстаўляюць пад выглядам «герояў нацыянальна-вызваленчага руху» і «змагароў з савецкай уладай». Але трэба нагадаць, што на сумленні атрадаў гэтых «дзеячаў» колькасцю да 30 тысяч чалавек, якія дзейнічалі на тэрыторыі Літвы з 1944 да 1956 года, забойствы звыш 25 тысяч грамадзянскіх людзей, у тым ліку дзяцей, жанчын і старых. Большасць ахвяр — этнічныя літоўцы. Многія з бандытаў з'явіліся калабарацыяністамі, уваходзілі ў структуры акупацыйнай адміністрацыі Трэцяга рэйха і былі непасрэдна датычныя да Халакосту ў Літве ў гады Другой сусветнай вайны.

Кіраўніцтва Літвы таксама прыкладае намаганні па праслаўленні ўдзельнікаў нацысцкай «Вафен-СС» і ўкрывальніцтве ад суда калабарацыяністаў, якія засталіся ў жывых. У пачатку студзеня 2022 года стала вядома, што ўлады Літвы (як раней і Латвіі) афіцыйна адмовіліся аказваць Беларусі дапамогу ў расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вільнюс і Рыга адмовілі ў прававой дапамозе Мінску ў расследаванні масавага забойства мірнага насельніцтва, а ў якасці апраўдання ўказалі, што такое ўзаемадзеянне можа паўплываць на пытанні іх нацыянальнай бяспекі.

У Малдове сцэнарый падобны. У гэтай краіне таксама складваецца трывожная і сітуацыя з захаваннем асноўных правоў чалавека. «Правячыя сілы вядуць краіну да поўнага краху эканомікі, яе трапляння пад поўную залежнасць ад заходніх фінансавых устаноў і да дэмаграфічнай катастрофы ў выніку масавай эміграцыі, — адзначаюць аўтары даклада. — Тое, што адбываецца сёння ў Малдове, практычна цалкам супадае з тымі працэсамі, якія назіраліся ва Украіне. Рэжым Маі Санду падобны да рэжыму Уладзіміра Зяленскага, а да яго Пятра Парашэнкі, «на шляху да еўраінтэграцыі» імкнецца таталітарнымі метадамі «адмяніць» цэлы этап гісторыі ўласнай краіны, знішчыўшы ўсю савецкую спадчыну, у тым ліку і любыя праявы культуры нацыянальных меншасцяў. Больш за тое, дзеля ўступлення ў ЕС малдаўскія ўлады нават дэманструюць гатоўнасць знішчаць нацыянальную — малдаўскую — ідэнтычнасць краіны, выдаючы яе за румынскую».

Па ўказанні заходніх куратараў афіцыйны Кішынёў капіруе ў сваёй палітыцы дзеянні нацыяналістычных рэжымаў Украіны і краін Балтыі, заснаваныя на русафобіі і запазычаным з часоў халоднай вайны пячорным антысаветызме. «Такі курс культывуе ў грамадстве ідэю, згодна з якой процістаянне з Расіяй цяпер або ў мінулым, уключаючы СССР, становіцца безагаворачна правільным, штучна фарміруецца тоеснасць паняццяў «рускі — камуністычны — фашысцкі», — адзначаецца ў дакладзе.

### ВАЙНА З ПОМНІКАМІ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Польшчы застаецца вельмі трывожнай. Праваабарончая супольнасць адзначае шматлікія парушэнні, якія маюць месца ў шырокім коле сфер грамадскага жыцця. «Цяперашнія польскія ўлады робяць усё магчымае для фальсіфікацыі гісторыі Другой сусветнай вайны, слепа мяркуючы, што гэта будзе садзейнічаць паляпшэнню іміджу краіны. Прычынна-выніковыя сувязі і ацэнка падзей таго трагічнага для ўсяго чалавецтва перыяду мэтанакіравана скажаюцца дзеля палітычнай кан'юнктуры. Распаўсюджваюцца тэзісы, якія адмаўляюць вырашальны ўклад Чырвонай Арміі ў разгром гітлераўскай Германіі, а таксама прыкладаюцца намаганні па ліквідацыі савецкай/расійскай ваенна-мемарыяльнай спадчыны ў Польшчы, — адзначаецца ў дакладзе. — Пад сцягам барацьбы з «савецкай прапагандай» і фарміраваннем «правільнай» гісторыі Другой сусветнай вайны ў Польшчы распаўсюджваецца культ нават такіх «змагароў з камунізмам», якія заплямілі сябе супрацоўніцтвам з нацыстамі, ваеннымі злачынствамі і забойствамі мірнага насельніцтва».

Польшча з'яўляецца адной з краін, улады якой актыўна вядуць вайну з помнікамі і мемарыяламі ў гонар байцоў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час вызвалення краіны ад нацызму ў гады Другой сусветнай вайны. Фіксуюцца нярэдкія выпадкі распаўсюджвання прадукцыі з нацысцкай сімволікай або публікацыі прац нацыстаў. Звярнулі ўвагу аўтары даклада і на ўсё большыя ў Польшчы праявы ксенафобіі і нецярпімасці ў адносінах да мігрантаў. Польскія і міжнародныя праваабарончыя грамадскія арганізацыі звязваюць гэта з прыходам да ўлады ў кастрычніку 2015 года нацыянал-кансерватыўнай партыі «Права і справядлівасць» (ПіС) і рэформамі, якія ёю праводзяцца.

«Зыходзячы з аналізу прыведзенай у дакладзе інфармацыі, у якасці агульнай высновы напрошваецца наступнае меркаванне. У новым свеце, у аснову якога павінна быць пакладзена больш справядлівая сістэма міжнародных адносін, вельмі неабходна поўная рэалізацыя прынцыпу суверэннай роўнасці дзяржаў, гістарычных, культурных, рэлігійных і нацыянальных асаблівасцяў кожнай краіны, — робяць высновы аўтары дакумента. — Толькі пры выкананні гэтых умоў будзе магчыма поўнае выкараненне негатыўных наступстваў каланіялізму, неакаланіяльнага мыслення, расізму, расавай дыскрымінацыі і звязаных з імі відаў нецярпімасці. Гэта дасць магчымасць прадухіляць неправамерныя спробы асобных краін «падмяць» пад сябе сістэму міжнароднага права і выкарыстоўваць яго ўніверсальныя праваабарончыя механізмы ў сваіх вузкакарыслівых мэтах».

**Пётр ДУНЬКО.**

**Даслоўна**

### «Наш абавязак — казаць праўду»

Кожны, хто парушаў правы чалавека, забіваў іншых людзей, будзе адказваць за свае дзеянні. Мы даб'ёмся таго, што міжнароднае права будзе адноўлена. Аб гэтым заявіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег Гайдукевіч у эфіры тэлеканала «Беларусь1». Парламентарый нагадаў, што міністэрствы замежных спраў Беларусі і Расіі падрыхтавалі першы сумесны даклад аб сітуацыі з правамі чалавека ў асобных краінах. «Я лічу, што гэта вельмі важная праца. Гэта абавязкова трэба рабіць. Наш абавязак — казаць праўду. Таму гэтая справа будзе працягвацца», — падкрэсліў дэпутат.

# ЛЕТА Ў ЗАПАС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цана на суніцы садовыя (клубніцы) у Лунінецкім і Столінскім раёнах (рэгіёнах найбольш масавага вырошчвання агароднінай, ягаднай і пладовай прадукцыі) складае ад 3 да 8 рублёў за кілаграм у залежнасці ад сорту, якасці, памеру ягад і таго рынку, які стварае пакупніцкі попыт, паведаміла спецыяліст. Адсюль і цана для канчатковага пакупніка, дадала яна.

Белкаапсаюз — адзіная ў краіне арганізацыя, якая прымае ў насельніцтва нават ягады, ужо непрыдатныя для пакупніка (пераспелыя), растлумачыў **намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза Віктар КАРАЛЁЎ.** Такія ягады перапрацоўваюцца на вінаробных прадпрыемствах сістэмы спажыўкааперацыі.

— У сезоне зафіксавана цана на агуркі, — працягнула Аксана Скіндэр.

З 4 да 10 чэрвеня ў Альшанах за кілаграм агуркоў здатчыкам прапанавалі 70—80 капеек, сёння — ужо 1,5 рубля. Зрэшты, цана таксама залежыць ад вонкавага выгляду, сорту, смакавых якасцяў пладоў.

— Пачалася нарыхтоўка чарніц, таксама мы прыступілі да нарыхтоўкі лісічак, — адзначыла спецыяліст.

Цана на чарніцы — у дыяпазоне ад 6 да 8 рублёў за кіло. Масавая нарыхтоўка чарніц актыўна ідзе ў паўднёвых рэгіёнах Беларусі, у Магілёўскай і Віцебскай абласцях яе пачалі ў гэтыя выхадныя. Лісічкі Белкаапсаюз закупляе па цане ад 6 да 10 рублёў за кілаграм.

Раней значная частка здадзеных насельніцтвам чарніц і лісічак адпраўлялася на экспарт у краіны ЕС, адзначыла начальнік упраўлення нарыхтовак. Сёння галоўнымі стратэгічнымі партнёрамі ў гэтым напрамку Белкаапсаюз бачыць расійскія рэгіёны.

— Спадзяёмся, што наша прадукцыя будзе запатрабавана, — рэзюмавала яна.

Насельніцтва і гаспадаркі ўжо масава здаюць маладую капусту, пекінскую капусту, маладую бульбу, паведаміла Аксана Скіндэр. Закупачная цана на гэтую гародніну — ад паўтара рубля за кіло. У паўднёвых рэгіёнах вяскоўцы здымаюць першыя ўраджаі маладых буракоў і кабачкоў, а таматы нарыхтоўшчыкі прымаюць па 3-4 рублі за кілаграм.

— У сістэме спажыўкааперацыі задзейнічана 760 прыёмна-нарыхтоўчых пунктаў і звыш 800 нарыхтоўшчыкаў, — расказаў Віктар Каралёў. — Дадаткова да сезона нарыхтовак наймаюцца пазаштатныя нарыхтоўшчыкі. У гэтым годзе ў нарыхтоўчай кампаніі ўдзельнічае больш за 3000 аб'ектаў гандлю, размешчаных у сельскай мясцовасці. Мы пастаянна праводзім інфармацыйную работу аб патрабаваннях да якасці прадукцыі, якая закупляецца. Працуюць гарачыя тэлефонныя лініі ў раённых і абласных арганізацыях.

Спажыўкааперацыя супрацоўнічае больш як з 200 фермерскімі гаспадаркамі і ўжо заключыла сёлета 255 дагавораў на закупку каля васьмі тысяч тон прадукцыі, дадаў ён. Насельніцтва і фермеры таксама маюць магчымасць рэалізаваць уласную прадукцыю самастойна:

— На 107 падведамасных рынках для гэтага выдзелена больш за 30 тысяч гандлёвых месцаў, — сказаў Віктар Каралёў.

Штогод арганізацыі спажыўкааперацыі ствараюць запас бульбы і садавіна-гароднінnай прадукцыі на міжсезонны перыяд — у аб'ёмах, устаноўленых заданнямі аблвыканкамаў, паведамілі прадстаўнікі Белкаапсаюза. Для гэтага ёсць 47 сховішчаў на 164 камеры з раздзельным захоўваннем.

## Сацыяльная місія

— Дзейнасці Белкаапсаюза сёння ўдзяляецца асаблівая ўвага. Гэта звязана з рэалізацыяй задач па павышэнні якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва і неабходнасцю павышэння эфектыўнасці работы сістэмы, — распавёў Віктар Каралёў напярэдадні Дня кааперацыі, які ў нашай краіне адзначаецца ў першую суботу ліпеня.



Ён паведаміў, што вызначана пакрокавая стратэгія паляпшэння сітуацыі для атрымання значнага выніку, дапрацавана праграма развіцця спажывецкай кааперацыі на 2024—2025 гады. Белкаапсаюз — устойлівая структура, якая аб'ядноўвае 258 000 пайшчыкаў, рэалізоўвае цэлы комплекс паслуг у кожным рэгіёне і забяспечвае занятасць, сацыяльныя гарантыі і стабільны даход для больш чым 34 000 работнікаў, падкрэсліў Віктар Каралёў:

— Сукупны аб'ём дзейнасці сістэмы спажывецкай кааперацыі складае амаль 280 млн рублёў у месяц, а за 2023-і гэтая лічба дасягнула 3,3 млрд рублёў. Белкаапсаюз — адзін з найбуйнейшых падаткаплацельшчыкаў краіны. За 2023 год ад спажывецкай кааперацыі ў бюджэт паступіла больш як 180 млн рублёў падатковых плацяжоў і каля 97,5 мільёна адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Работу сістэмы спажыўкааперацыі раней крытыкавалі за стратнасць, і крытыка была справядлівай, але за пяць месяцаў 2024 года Белкаапсаюз скараціў страты больш як у 3,5 раза, расказаў намеснік старшыні праўлення:

— Пакуль не выйшлі на прыбытковую работу, але значна скарацілі страты. Мы можам скараціць страты толькі за кошт прамысловасці і нарыхтоўчай дзейнасці. Па рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ і паслуг выйшлі на станоўчы вынік, але на чысты прыбытак — яшчэ не. Да канца года ў цэлым па сістэме плануем выйсці на прыбытковую работу.

Па выніках мінулага года Белкаапсаюз рэалізаваў тавараў на суму каля 2 млрд рублёў, або 3,2 % ад агульнага аб'ёму продажаў гандлёвых арганізацый краіны. Спажывецкая кааперацыя абслугоўвае каля 30 % насельніцтва Беларусі (больш за 3,3 млн чалавек), і ў асноўным гэта сельскае насельніцтва. Справа ў тым, што адна з галоўных місій, ускладзеных на Белкаапсаюз, сацыяльная, падкрэсліў Віктар Каралёў:

— Менавіта ў абслугоўванні жыхароў маленькіх населеных пунктаў заключаецца сацыяльная роля спажыўкааперацыі. Мы працуем не паралельна развіццю прыватных ініцыятыў, а часта аднаасобна, несучы цяжар адказнасці за якасць жыцця і даступнасць паслуг насельніцтву ў найбольш затратных сегментах — аддаленых пунктах сельскай мясцовасці.

## Куды даедзе аўтакрама?

Гандлёвая інфраструктура Белкаапсаюза — гэта абслугоўванне насельніцтва на больш як 4500 аб'ектах, з якіх 3200 — у сельскай мясцовасці. 513 аўтакрам спажывецкай кааперацыі даязджаюць да самых аддаленых вёсак.

— Нашы аўтакрамы абслугоўваюць больш за 450 тысяч чалавек. У вясновa-летні перыяд колькасць населеных пунктаў узрастае прыкладна на паўтары тысячы за кошт садаводчых таварыстваў. З населеных пунктаў, што абслугоўваюць аўтакрамы, у 11 300 пражывае да 50 чалавек, у 5300 колькасць насельніцтва — менш за 10 чалавек. Так, гэта затратна. Але часам альтэрнатывы няма. Нягледзячы на затратнасць і цяжкадаступнасць маршрутаў, мы ажыццяўляем гэту функцыю, — звярнуў увагу Віктар Каралёў.

І сёння адна з першарадных задач — мадэрнізацыя аўтапарка, адзначыў ён. Да канца года запланавана набыццё 110 айчынных аўтакрам.

— Да гандлёвых фургонаў прад'яўляюцца высокія санітарныя патрабаванні, — растлумачыў намеснік кіраўніка галіны. — Аўтакрамы павінны мець халадзільнае абсталяванне і дадатковую палічную прастору для шырокага асартыменту. Усяго ж плануецца замяніць 264 аўтакрамы з улікам аднаўлення аўтапарка, мадэрнізацыі і рамонту.

Па выніках мінулага года Белкаапсаюз рэалізаваў тавараў на суму каля 2 млрд рублёў. Пры гэтым доля тавараў айчыннай вытворчасці ў асартыменце гандлёвых аб'ектаў спажыўкааперацыі складае больш за 90 %. За пяць месяцаў бягучага года ўжо рэалізавана тавараў на суму больш за мільён рублёў. І гэта не толькі прадукты харчавання, але і самыя розныя тавары.

— У гэтай структуры складаная бытавая тэхніка займае прыкладна 50 %, мэбля — 40 %, а астатняя частка — мота- і веластавары, — паведаміў Віктар Каралёў.

Кожны пакупнік мае магчымасць з дапамогай аўтакрамы або праз стацыянарную гандлёвую сетку заказаць той тавар, які не прадугледжаны асартыментным пералікам, расказалі прадстаўнікі Белкаапсаюза.

— Белкаапсаюз — адкрытая сістэма, мы гатовы да камунікацыі з пакупнікам, — падкрэсліла **начальнік упраўлення гандлю Белкаапсаюза Вольга КУНЦОВА.** — Па адзіным нумары для ўсёй краіны (+375 29 107 93 93) любы пакупнік можа замовіць любы тавар, які мы прывязём альбо да крамы, альбо аўтакрамай. Сельскія жыхары ўсё больш актыўна карыстаюцца гэтай паслугай. Попытам праз кантакт-цэнтр карыстаюцца электратэхніка, будаўнічыя матэрыялы, тавары бытавога прызначэння, прадукцыя для кармлення жывёл і птушкі. Ёсць заяўкі і на пэўныя прадукты харчавання.

У мэтах зніжэння рознічных цэн для пакупнікоў вядзецца работа з пастаўшчыкамі па правядзенні сумесных маркетынгавых і акцыйных мерапрыемстваў, дадаў Віктар Каралёў. Акцыйны пакет са зніжэннем цэн фарміруецца штомесяц.

У рэгіёнах захаваць крамы бывае складана з улікам развіцця рытэйлу. «Развіццё канкурэнцыі ў сферы гандлю аказала на нашу дзейнасць сур'ёзны ўплыў», — падкрэсліў намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза. Тым не менш ёсць прыклады раёнаў, дзе ўдзельная вага спажыўкааперацыі ў рознічным абароце дасягае 55 %:

— Наша гандлёвая сетка мае значны рэсурс самазабеспячэння за кошт магчымасцяў нарыхтоўчых арганізацый, уласнай вытворчасці прадукцыі прадпрыемствамі кааператыўнай прамысловасці і грамадскага харчавання.

Белкаапсаюз — шматгаліновая структура, і яе станоўчы фінансавы вынік у многім залежыць ад тых галін, якія прыносяць даходную частку — прамысловасць, нарыхтоўкі, сказаў намеснік старшыні праўлення.

— За кошт гэтых галін мы кампенсуем тую затратную частку, якую маем у гандлі. Мы не закрываем стратныя гандлёвыя аб'екты ў вёсцы, Белкаапсаюз бярэ на сябе сацыяльную ролю абслугоўвання насельніцтва.

Сёння ідзе працэс узгаднення нарматыўнага дакумента — указа кіраўніка дзяржавы, які будзе накіраваны якраз на падтрымку спажывецкіх кааперацый, адзначыў Віктар Каралёў.

## Традыцыі беларускай кухні

Галіна грамадскага харчавання Белкаапсаюза — гэта 779 аб'ектаў, 281 з якіх размешчаны ў сельскай мясцовасці. За 2023 год гэтымі паслугамі кааператараў скарысталася больш за 3,5 млн чалавек. Штогод увесну і ўлетку арганізоўваецца дзейнасць дробнарознічнай сеткі: міні-кафэ, павільёны, летнія пляцоўкі, пункты вынаснога гандлю. Але прыярытэтны кірунак у гэтай сферы — спецыялізаваныя сеткі, якія налічваюць каля 73 аб'ектаў: «ЛепімСамі», TASTY, «Ежа&Кава», «Гастралаўка».

— У галіне грамадскага харчавання надаём значэнне прыдарожнаму сэрвісу, — распавёў Віктар Каралёў. — Гэта каля 386 аб'ектаў гандлю і 58 аб'ектаў харчавання.

Белкаапсаюз актыўна ўдзельнічае ў развіцці гастранамічнага турызму, падкрэсліў ён:

— На 172 аб'ектах грамадскага харчавання спажыўкааперацыі ў меню асобным раздзелам выдзелены стравы беларускай кухні. У цэлым, калі казаць аб стратэгіі развіцця галіны грамадскага харчавання, стаіць задача сфарміраваць сучасную індустрыю гасціннасці.

Галіна грамадскага харчавання Белкаапсаюза мае вялікі вопыт работы па арганізацыі выязнога абслугоўвання: штогод яе суб'екты бяруць удзел у больш чым 1000 рэгіянальных і мясцовых мерапрыемствах. Традыцыйна Белкаапсаюз — адзін з ключавых аператараў па аказанні паслуг грамадскага харчавання на такіх мерапрыемствах, як «Дажынкі», «Славянскі базар», «Александрыя збірае сяброў». Сёння сістэма спажыўкааперацыі рыхтуецца да выязнога гандлёвага абслугоўвання, якое будзе арганізавана ва ўсіх рэгіёнах на мерапрыемствах, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ИНВЕСТИЦИОННЫЙ СТАРТ»

Настоящие Правила проведения рекламной игры «Инвестиционный старт» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Инвестиционный старт» (далее – Рекламная игра).

**Термины, используемые в Правилах Рекламной игры**

В Правилах используются следующие термины:

aigenis invest – мобильное приложение для мобильных устройств на базе операционных систем Google Android, Apple iOS.

web-версия aigenis invest https://web.aigenis.by/#/ru/signIn (далее – web-версия) – веб-приложение для стационарных устройств запускается в браузере.

Участник Рекламной игры (далее – Участник) – физическое лицо – гражданин Республики Беларусь либо иностранный гражданин, имеющий вид на жительство в Республике Беларусь, достигший 18-летнего возраста, прошедший регистрацию в мобильном приложении aigenis invest и/или web-версии, а также являющийся действующим клиентом ЗАО «Айгенис», совершивший покупку хотя бы 1 (одной) ценной бумаги через мобильное приложение aigenis invest и/или web-версию, на сумму от 200,00 (двести) белорусских рублей 00 копеек без учета брокерской комиссии, биржевых и клиринговых сборов, **в период с 01.07.2024 г. по 30.08.2024 г.,** а также выразивший желание принять участие в Рекламной игре путем активирования свитчера (ползунка) в форме, закрепленной в разделе «Рекламные игры и акции», в мобильном приложении aigenis invest и/или в web-версии.

**1. Организатор Рекламной игры**

Организатором Рекламной игры является ЗАО «Айгенис», УНП 100862882, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000 г. Юридический адрес: 223062, Республика Беларусь, Минск, пр-т Победителей, 108, пом. 7, офис 201. E-mail: info@aigenis.by.

**2. Наименование Рекламной игры**

Рекламная игра носит название: «Инвестиционный старт»

**3. Территория проведения Рекламной игры**

Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь, посредством использования мобильного приложения aigenis invest и/или web-версии.

**4. Период проведения Рекламной игры**

Начало Рекламной игры: 01 июля 2024 года.

Окончание Рекламной игры: 10 октября 2024 года (включая период проведения розыгрыша, выдачи призов, опубликования результатов Рекламной игры).

**5. Состав Комиссии по проведению Рекламной игры**

Для проведения Рекламной игры, контроля за соблюдением Правил Рекламной игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрыша Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:

1. Председатель комиссии – заместитель директора по экономике и инвестициям ЗАО «Айгенис» – Санкович Вероника Сергеевна.

2. Члены комиссии:

- начальник брокерского отдела ЗАО «Айгенис» – Аполенис Марина Владимировна;
- начальник депозитария ЗАО «Айгенис» – Забавская Юлия Викторовна;
- главный юрисконсульт ЗАО «Айгенис» – Луценко Елена Валерьевна;
- экономист-аналитик брокерского отдела ЗАО «Айгенис» – Пашко Сергей Михайлович;
- индивидуальный предприниматель – Сикорская Ольга Владимировна.

**6. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Рекламная игра**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации брокерских услуг ЗАО «Айгенис», посредством использования мобильного приложения aigenis invest и/или web-версии.

**7. Участники Рекламной игры**

В Рекламной игре могут принять участие физические лица, граждане Республики Беларуси либо иностранные граждане, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, достигшие 18-летнего возраста, прошедшие регистрацию в мобильном приложении aigenis invest и/или web-версии, а также являющиеся действующими клиентами ЗАО «Айгенис», совершившие покупку хотя бы 1 (одной) ценной бумаги через мобильное приложение aigenis invest и/или web-версию на сумму от 200,00 (двести) белорусских рублей 00 копеек без учета брокерской комиссии, биржевых и клиринговых сборов, **в период с 01.07.2024 г. по 30.08.2024 г.,** а также выразившие желание принять участие в Рекламной игре путем активирования свитчера (ползунка) в форме, закрепленной в разделе «Рекламные игры и акции», в мобильном приложении aigenis invest и/или в web-версии.

Участником Рекламной игры **не может** быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства и члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**8. Права участников Рекламной игры**

Участник Рекламной игры имеет право знакомиться с Правилами Рекламной игры, принимать участие в ней, присутствовать на розыгрыше призового фонда, получать соответствующие призы на условиях, определенных настоящими Правилами.

Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре 1 (один) раз при выполнении условий Рекламной игры, за исключением категории Участников, описанных в подпункте 9.3. пункта 9 Правил.

**9. Порядок участия в Рекламной игре**

9.1. Для участия в Рекламной игре в период с 01.07.2024 г. по 30.08.2024 г. необходимо выполнить следующие условия:

9.1.1. Для новых пользователей приложения aigenis invest пройти регистрацию (зарегистрироваться в мобильном приложении можно скачав его в магазинах AppStore или Google Play или пройдя регистрацию в web-версии).

Для регистрации необходимо:

- заполнить имя, телефон, адрес электронной почты;
- получить на указанный пользователем в анкете номер телефона код активации, ввести его в личном кабинете;
- создать пароль для регистрации в мобильном приложении;
- пройти регистрацию с помощью межбанковской системы идентификации и подтвердить паспортные данные;
- завершить регистрацию, оформив онлайн договор на брокерские услуги (для доступа на торги белорусской валютно-фондовой биржи) и бесплатное открытие счета «депо» (для учета ценных бумаг в Депозитарии «Айгенис»).

Для участников, прошедших регистрацию и являющихся действующими клиентами ЗАО «Айгенис», дополнительно проходить регистрацию не требуется.

9.1.2. Всем участникам, прошедшим регистрацию в мобильном приложении aigenis invest и/или web-версии, предоставляется право дать согласие на участие в Рекламной игре, а также согласие на обработку персональных данных в целях регистрации в качестве участника Рекламной игры «Инвестиционный старт».

9.1.3. Выражение согласия на обработку персональных данных осуществляется путем активирования свитчера (ползунка) в форме, закрепленной в разделе «Рекламные игры и акции», в мобильном приложении aigenis invest и/или в web-версии.

9.1.4. Последствием отказа в даче согласия, а также отзыва согласия, путем деактивации свитчера (ползунка) является невозможность обработки персональных данных в указанных целях и соответственно отсутствие возможности участия в Рекламной игре.

9.1.5. Совершить минимум одну покупку ценных бумаг через мобильное приложение aigenis invest и/или web-версию на сумму от 200,00 (двести) белорусских рублей без учета брокерской комиссии, биржевых и клиринговых сборов.

9.2. Шанс на участие в Рекламной игре предоставляется каждому Участнику, который в период с 01.07.2024 г. по 30.08.2024 г. заключил на торгах в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» посредством мобильного приложения aigenis invest и/или его web-версии хотя бы одну сделку на приобретение ценных бумаг, при этом за период с 01.07.2024 г. по 30.08.2024 г. сумма сделок на приобретение данным Участником ценных бумаг должна превышать сумму сделок, заключенных им на продажу ценных бумаг, не менее чем на 200,00 (двести) белорусских рублей 00 копеек без учета брокерской комиссии, биржевых и клиринговых сборов.

9.3. Каждому Участнику, выполнившему условия подпунктов 9.1 и 9.2. пункта 9. Правил Рекламной игры, предоставляется один шанс на участие в Рекламной игре.

Каждому Участнику, который ранее, до начала проведения Рекламной игры, не заключал на торгах в ОАО "Белорусская валютно-фондовая биржа" посредством мобильного приложения aigenis invest и/или его web-версии сделок на приобретение ценных бумаг, предоставляется еще один **дополнительный бонусный шанс** на участие в Рекламной игре.

9.4. В розыгрыше призового фонда принимают участие граждане Республики Беларусь либо иностранные граждане, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, достигшие 18-летнего возраста и выполнившие требования подпунктов 9.1 и 9.2. пункта 9 настоящих Правил.

9.5. Не позднее 08.09.2024 включительно Организатор направляет каждому Участнику Рекламной игры СМС-сообщение, на указанный при регистрации номер телефона, с порядковым Игровым номером.

**10. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора в размере 17 241,38 (семнадцать тысяч двести сорок одна тысяча) белорусских рублей 38 копеек. Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.

| № п/п | Наименование приза | Количество | Стоимость за единицу, бел. руб. | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежные средства на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» | 1 | 8 000,00 | 9 195,40 |
| | Денежные средства | | 1 195,40 | |
| 2 | Денежные средства на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» | 1 | 5 000,00 | 5 747,13 |
| | Денежные средства | | 747,13 | |
| 3 | Денежные средства на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» | 1 | 2 000,00 | 2 298,85 |
| | Денежные средства | | 298,85 | |

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**

Розыгрыш призового фонда Рекламной игры будет проводиться 10.09.2024 в 17.00 в офисе ЗАО «Айгенис», расположенному по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 108, пом. 7, офис 201.

**12. Механика розыгрыша призового фонда Рекламной игры. Определение Победителя Рекламной игры и информирование Победителя**

12.1. Для проведения розыгрыша Рекламной игры формируются списки Участников Рекламной игры, выполнивших условия Рекламной игры и имеющих минимум 1 (один) шанс на участие в розыгрыше Рекламной игры.

12.2. Список Участников Рекламной игры состоит из следующих полей:

- порядковый Игровой номер Участника Рекламной игры, который присваивается по ФИО Участника Рекламной игры в алфавитном порядке (порядковый Игровой номер назначается на каждый шанс Участника Рекламной Игры);
- ФИО Участника Рекламной игры.

12.3. Для проведения розыгрыша используется вращающийся прозрачный барабан (далее – лототрон), набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение победителя производится посредством определения выигравшего порядкового Игрового номера Участника Рекламной игры.

Определение выигрышного порядкового Игрового номера происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

Первый разряд порядкового Игрового номера участника Рекламной игры определяется следующим путем: в лототрон Организатором загружаются шары с номерами от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего порядкового Игрового номера участника Рекламной игры. Шары перемешиваются и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного порядкового Игрового номера Участника Рекламной игры. Номер шара вносится в протокол. Далее в лототрон повторно загружается один набор шаров в количестве до 10 штук с номерами, которые существуют по сверенному списку порядкового Игрового номера Участников Рекламной игры в соответствующем разряде. Шары перемешиваются и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного порядкового Игрового номера Участника Рекламной игры. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся последовательно в протокол, тем самым определяется выигрышный порядковый Игровой номер.

Первым объявляется Победитель, который получит денежный приз на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» на сумму 2298,85 BYN (две тысячи двести девяносто восемь) белорусских рублей 85 копеек;

вторым – Победитель, который получит денежный приз на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» на сумму 5 747,13 BYN (пять тысяч семьсот сорок семь) белорусских рублей 13 копеек;

третьим – Победитель, который получит денежный приз на формирование инвестиционного портфеля в ЗАО «Айгенис» на сумму 9 195,40 BYN (девять тысяч сто девяносто пять) белорусских рублей 40 копеек.

12.4. Итоги розыгрыша призового фонда Рекламной игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

12.5. Участники Рекламной игры вправе ознакомиться с результатами розыгрыша на официальном сайте компании www.aigenis.by.

Результаты розыгрыша будут опубликованы на официальном сайте www.aigenis.by в день розыгрыша не позднее 21.00.

12.6. После проведения розыгрыша Победитель Рекламной игры извещается о выигрыше путем телефонного звонка и/или уведомления по электронной почте и/или посредством СМС-сообщения на указанные при регистрации номер телефона и электронную почту, в день розыгрыша до 21.00.

**13. Порядок выдачи Приза**

13.1. После получения уведомления о выигрыше Победителям необходимо не позднее 01.10.2024 предоставить Организатору информацию для получения приза любым из указанных способов:

а) лично прибыть по адресу Организатора: г. Минск, пр-т Победителей, 108, пом. 7, офис 201 в рабочие дни с 09.00 до 18.00;

б) письмом на электронный почтовый ящик info@aigenis.by.

а именно:

- копию документа, удостоверяющего личность (далее – документ) с информацией о дате выдачи документа, серии и номера документа, органа, выдавшего документ, идентификационного номера;
- копию документа, подтверждающего адрес регистрации (копию страниц из паспорта гражданина Республики Беларусь и/или вида на жительство, для лиц, имеющих вид на жительство в Республике Беларусь и/или копию выписки из лицевого счета);
- копию заявления/выписки об открытии счета в банке (банковские реквизиты) на который будет перечисляться сумма денежного приза.

Суммы приза, за вычетом удержанной суммы подоходного налога, зачисляются ЗАО «Айгенис» на банковский счет Победителя не позднее 10.10.2024.

Подтверждением получения каждым Победителем приза является платежный документ, подтверждающий перевод денежных средств со счета ЗАО «Айгенис» на банковский счет Победителя.

13.2. При получении приза каждый Победитель несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. В соответствии с Налоговым Кодексом Республики Беларусь Организатор при вручении приза выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза.

13.3. В случае отказа Победителя Рекламной игры от получения приза либо невыполнение условий его получения, приз остается у Организатора и используются по усмотрению Организатора.

13.4. Ответственность Организатора по выдаче приза ограничена исключительно Призовым фондом, указанным в пункте 10 настоящих Правил.

13.5. Организатор не оплачивает Участникам расходы, связанные с проездом к месту розыгрыша, а также к месту получения приза.

13.6. Организатор не несет ответственность, если не по его вине у Участника отсутствует доступ к сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги Интернет), электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с Участником и т. д.).

13.7. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с настоящими Правилами, в том числе условиями выдачи призов.

Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры**

Правила Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала проведения Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 14.09.2024 г., а также на сайте Организатора: www.aigenis.by.

Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по:

телефону: +375 (29) 513-16-55 в пн-пт с 09.00 до 13.00, и с 14.00 до 18.00, кроме выходных и праздничных дней;

на сайте Организатора www.aigenis.by;

в мобильном приложении aigenis invest и/или web-версии.

**15. Прочие условия**

Участие в Рекламной игре подразумевает ознакомление Участниками с полным текстом настоящих Правил и согласие с Правилами. Несоблюдение Участниками настоящих Правил считается отказом от участия в Рекламной игре со всеми вытекающими последствиями (включая утерю права на получение приза и т. п.).

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры, могут быть обжалованы в установленном законодательством порядке.

Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении проведения Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по адресу: 220062, г. Минск, пр-т Победителей, д. 108, помещение 7, офис 201.

Споры между Организатором Рекламной игры и Участниками Рекламной игры рассматриваются согласно действующему законодательству Республики Беларусь.

*Свидетельство № 4441 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 24 июня 2024 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Як змагацца з белакрылкай

**Белакрылкі — маленькія, памерам усяго 1,5—3 мм, мучніста-белага колеру, падобныя на матылькоў, шкодныя садовых і пакаёвых раслін. Яны здольныя на ўсіх стадыях развіцця наносіць моцныя страты лісцю як кветкавых раслін у доме, так і садовых культур. У асноўным на агародзе гэта агуркі, памідоры, перцы і баклажаны. Асабліваю шкоду раслінам наносяць лічынкі, якія сілкуюцца сокам лісця. Яны мацуюцца да ніжняй паверхні ліста.**

У летні час шкоднікі лёгка пераносяцца патокам паветра з іншых заражаных участкаў.

Увесну перанос яек насякомага магчымы з новай глебай або расадай.

Спрыяльнымі ўмовамі для развіцця велізарнага сямейства белакрылак, з прычыны іх выключнай пладавітасці, з'яўляюцца цяплічныя: павышаная вільготнасць і цеплыня, цесната расліннай масы і парушаная вентыляцыя.

***Як вызначыць наяўнасць шкодніка:***

• Страсянуць расліну — узнімаецца рой белых мошак.

• На ніжнім баку лісця можна ўбачыць амаль празрыстыя, светлыя лускавінкі — лічынкі шкодніка.

• На паверхнях лісця можна ўбачыць ліпкі, бліскучы налёт — падзь, якую вылучаюць у выглядзе адходаў лічынкі. Расліны становяцца ліпкімі навобмацак.

• На лісці можна ўбачыць чорныя плямы — гэта сажыстыя грыбкі, якія сілкуюцца ліпкім налётам насякомых.

• Расліна сохне, лісце скручваецца, жоўкне.

У спрыяльных умовах жыццёвы цыкл насякомага ўсяго 20 дзён ад яйка да дарослай асобіны. На 25 дзень свайго жыццёвага цыкла белакрылка ўжо здольная прыносіць патомства. Насякомае гіне пры тэмпературах ніжэй чым +10 °C, а яйкі могуць перачакаць падзенне тэмператур.

З яек з'яўляюцца лічынкі і пачынаюць высмоктваць сок з лісця. У працэсе такой жыццядзейнасці яны выдзяляюць шмат ліпкага сакрэту і актыўна перасоўваюцца.



Затым лічынкі пераходзяць у сваю наступную стадыю развіцця, становяцца нерухомымі і пакрываюцца васковым налётам. У такім стане лічынкі ўжо не паддаюцца апрацоўцы інсектыцыдамі. З іх выходзяць прадукты распаду ў выглядзе вадкасці, якую любяць грыбкі, ад чаго ніжняя паверхня лісця чарнее, парушаюцца працэсы фотасінтэзу. Такая сімбіятычная сувязь: казурка, лічынка, грыбкі знішчаюць расліну за некалькі дзён.

Калі вы ўбачылі чорны налёт, то такую расліну практычна немагчыма выратаваць. Яе трэба знішчыць, каб засцерагчы іншыя пасадкі ад заражэння.

Калі заўважаны толькі дарослыя асобіны і адкладзеныя яйкі, а таксама лічынкі ў выглядзе макулінак без васковага налёту на лісці раслін, варта пазмагацца з гэтай пошасцю.

Паколькі насякомае на ўчастку знаходзіцца ў розных стадыях развіцця, то і змагацца з ім неабходна спалучэннем метадаў: біялагічных, хімічных і механічных.

## Народныя спосабы барацьбы

Яны актуальныя на самых пачатковых стадыях, бо арыентаваны на механічнае пазбаўленне ад дарослых асобін, яек і лічынак, якія рухаюцца і сілкуюцца сокам раслін:

• Мыльны раствор. Гэты спосаб добры для невялікай колькасці пасадак. Прамыць уручную губкай або шлангам лісце, сцёблы і верхнюю частку глебы мыльнай вадой. Выкарыстоўваць цёмнае гаспадарчае ці дзёгцевае мыла, растварыць у прапорцыі адна частка надзёртага мыла і пяць частак вады. Метад паўтараць штотыдзень. Для вялікіх цяпліц гэты спосаб даволі працаёмкі.

• Часночны настой. Растаўчыце тры зубчыкі часнаку і развядзіце ў адным літры вады. Дайце настою суткі пастаяць у цёмным месцы. Працадзіце і апырсквайце расліны з усіх бакоў раз у тыдзень.

• Паніжэнне тэмпературы да +10 °C. Але такі спосаб знішчае толькі лятучых насякомых, яйкі і лічынкі здольныя перажыць паніжэнне тэмператур. У цяпліцах такое практычна немагчыма зрабіць, а пакаёвую расліну можна вынесці ў халоднае месца.

• Пасткі. Выкарыстоўвайце гатовыя ліпкія пасткі для мух у барацьбе з лятальнымі насякомымі. Выдатна працуюць самаробныя пасткі з фанерных лістоў. Афарбаваныя ў ярка-жоўты колер і пакрытыя ліпкім саставам з нагрэтых вазеліну, каніфолі, рыцыны і мёду, яны прыцягваюць і ўтрымліваюць шкоднікаў, калі тыя садзяцца на пастку. Лічыцца, што менавіта жоўты колер з'яўляецца найбольш прывабным для гэтых шкоднікаў.

Расліны, якія адпужваюць насякомых, называюцца рэпелентамі. Ёсць сярод іх і такія, якія вельмі не любяць белакрылкі. Гэта адзін з біялагічных спосабаў барацьбы са шкоднікам: настурцыя, палын, мята пярцовая, піжма дэкаратыўная.

Дастаткова пасадзіць расліны па перыметры градак або невялікімі ўкрапінамі ў садзе.

Ёсць расліны, якія, наадварот, прыцягваюць насякомых, і гэта можна выкарыстоўваць у сукупнасці з хімічным метадам:

Тытунь духмяны. Як толькі расліну з усіх бакоў аблепяць белыя мошкі, апырскаць хімічным сродкам, знішчыўшы адразу сотні дарослых асобін.

Белакрылка выдатна знішчаецца хімічнымі спосабамі з выкарыстаннем прэпаратаў на аснове імідаклапрыду і аверсэкціну. Таксама адзначана выдатнае ўздзеянне на колькасць шкоднікаў выкарыстанне фумігатараў супраць камароў у зачыненых на ноч цяпліцах.

Усе хімічныя сродкі выкарыстоўваюцца супраць дарослых асобін і лічынак, якія рухаюцца. Лічынкі, пакрытыя воскам, і яйкі захоўваюць сваю жыццёвую здольнасці нават пасля гэтыя спосабы з'яўляюцца таксічнымі для ўраджаю. Апрацоўка пестыцыдамі зеляніны — кропу, зялёнай цыбулі, пятрушкі — забараняецца.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.46 | 17.06 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.44 | 17.23 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.36 | 17.06 |
| Гомель — | 4.36 | 21.23 | 16.47 |
| Гродна — | 4.57 | 21.59 | 17.02 |
| Брэст — | 5.07 | 21.50 | 16.43 |

## Месяц

*Поўня 22 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Георгія, Елісея, Мікалая, Мсціслава, Мяфодзія.*
***К.** Марыі, Тэрэзы, Францішкі, Кірыла, Уладзіміра, Уладзіслава.*



Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Каханы, схадзі ў краму.**

**— Але, радасць мая, у такое надвор'е нават сабаку з дому не выганіш!**

**— Божа, ну схадзі без сабакі!**

Сяброўка віншуе з днём нараджэння:

— Дзяцей табе жадаю паслухмяных, бацькоў здаровых, мужа такога, які кахае...

— Дзякуй! А гэтых куды падзець?




## 27 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1909** год — нарадзіўся (в. Звонь Лепельскага павета) Сяргей Знаёмы (Сяргей Дзмітрыевіч Клопаў), беларускі журналіст, празаік, паэт. Дэбютаваў у друку вершам «Мая вясна» ў 1929 годзе ў газеце «Рабочий». У пачатку 1930-х вельмі актыўна выступаў у друку з нарысамі, карэспандэнцыямі. Запісваў і даследаваў беларускі фальклор. Займаўся мастацкім перакладам з рускай, украінскай і іншых моў.



**1925** год — нарадзілася (в. Нізок Уздзенскага раёна) Лідзія Арабей, беларускі празаік, крытык, літаратуразнаўца. У 1956 годзе выдала даследаванне «Цётка (Алаіза Пашкевіч)», а ў 1959-м — крытыка-біяграфічны нарыс «Хвядос Шынклер». Аўтар зборнікаў аповесцяў і апавяданняў «Мера часу», «Экзамен», «Ларыса», «На другой зіме вайны», «Ваўчкі», «Сярод ночы» і многіх іншых.

У свеце

**1898** год — канадзец Джошуа Слокам завяршыў першае ў гісторыі адзіночнае плаванне вакол свету: прайшоў на яхце «Спрэй» у адзіночку 46 000 марскіх міль, абагнуўшы зямны шар.

А пасля кругасветнага плавання Слокам на аснове свайго дзённіка напісаў кнігу «Адзін пад ветразем».

**1905** год — пачалося паўстанне на браняносцы «Князь Пацёмкін-Таўрычаскі», адна з прыкметных падзей рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі і першы выпадак узброенага мяцяжу цэлай вайсковай часці падчас гэтай рэвалюцыі. Праходзіла з 14 (27) чэрвеня да 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1905 года.



**1910** год — III Дзяржаўная дума прыняла Сталыпінскае аграрнае заканадаўства. Асноўная сутнасць сталыпінскай аграрнай рэформы заключалася ў тым, каб, адмяніўшы пакінутыя выкупныя плацяжы, даць магчымасць усім сялянам права свабодна выходзіць з абшчыны і замацоўваць за сабой надзельную зямлю ў спадчынную прыватную ўласнасць.

**1931** год — авіяканструктар Ігар Сікорскі атрымаў у ЗША патэнт на вынаходства першага гелікоптара — прэобраза верталёта.

Так гаварыў...

**ДЖЭК ЛОНДАН:**

*«Жыццё заўсёды дае чалавеку меней, чым ён ад яго патрабуе».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.644. Індэкс 63850. Зак. № 1369. Нумар падпісаны ў 19.30 26 чэрвеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12